БАС

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Да 20-годдзя рэгістрацыі ☞ 8-9

Фіёнікі ☞ 12

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 03 (2749) Год LIV | Беласток, 18 студзеня 2009 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Каляды ў адміраючай вёсцы

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Ласінская царква ў апошнія гады — доказ, што гарадскі і вясковы светы раўняюцца. Яна асветлена звонку як гарадскія ратушы і кафедры. Праўда, знаходзіцца яна на турыстычным шляху з Беластока ў Белавежу, пра што і паведамляюць прыдарожныя ўказальнікі (пакуль, на польскай мове) па згаданай шашы. Усярэдзіне храм таксама прайшоў салідны рамонт і на Каляды, хоць у наваколлі лес, паставілі штучную елку (каб іголкі не засмецілі дыван!). Аднак найбольш уражвае прыхадскія моладзевы і дзіцячы царкоўныя хары. Маладыя харысты свабодна выконваюць кампазіцыі Часнакова і Рахманінава. Іх не пасаромеліся б гарадскі музычны цэнтр або музычная школа. Гурты „Рамонак" і „Заранка", бо аб іх мова, займаюць першыя месцы на царкоўных фестывалях. Іх акадэмічны стыль у вясковай прыпушчанскай царкве выклікае каментарыі тыпу: „Старыя пеўчыя ўжо Ласінцы непатрэбныя, яны адно перашкаджаюць маладым".

У апошні час здзіўляе мяне таксама манаполія на ўкраінскія калядкі. Прытым маладыя харысты выступаюць у беларускіх народных касцюмах. Праўда, новая „традыцыя" з'явілася тут разам з дырыжоркамі родам з Украіны. Іх адных чамусьці запрашаюць на працу ў парафіі! Таму замест старых царкоўных кантаў, якія з сілай і красой заўсёды спяваліся ў ласінскай царкве, зараз гучаць калядкі тыпу „На нэбі зірка" ці „Рай розвіўся"! Варта дадаць, што Ласінская парафія — своеасаблівы феномен, калі ідзе пра навучанне беларускай мовы ў Нарваўскай гміне. Праўда, між сабой дзеткі размаўляюць ужо на польскай мове.

* * *

У першы дзень Каляд я разам з маладымі пайшла калядаваць па сваёй вёсцы. Цяжка прыдумаць прыгажэйшы і весялейшы абрад. Людзі абдароўваюць сябе радасцю, добрым словам, нясуць разам са сваім спевам у дом сілу, прыгажосць, надзею. Мы вырашылі завітаць у кожны яшчэ жывы двор. Праўда, з 39 двароў, якія я абыходзіла трыццаць гадоў таму, асталося толькі 18 (у двух, як кожны год, закрылі дзверы, у двух дамах была жалоба). У большасці хатак мы сустрэлі адных бабулек. Звычайна выседжвалі яны ля тэлевізараў, якіх не выключалі нават у час спеваў. Ніхто не наракаў на сусветны крызіс, нястачы. Наадварот, у кожнай хаце па меры магчымасці людзі падрыхтаваліся. Мы развучылі на галасы „Новая радасць" і свойскія пажаданні гаспадарам, якімі калісьці віншавалі сябе ласінскія парафіяне, называлі імёны цётак і іх гасцей. Магчыма таму людзі прымалі нас як найлепшых святочных пасланцоў. Хоць мы не разлічвалі на заробак, у 15 хатах закалядавалі 220 злотых (давалі ад 5 да 50 злотых). Апрача грошай нас запрашалі за стол, частавалі ласункамі, добрым словам і чаркай. Многія гаспадыні праводзілі нас аж за браму, запрашалі завітаць праз год. Цётка Зіна Іванюк выйшла на лесвіцу, каб распавесці нам пра ўнукаў, якія прыехалі прасіць яе з дзедам на вяселле. Яна ў свае 74 гады дачакалася ўжо чатырох праўнукаў.

— То байкі! — адказалі мы паводле мясцовай моды.

Праўда, час ад часу прыходзілася пачуць нараканні на свет тэхнікі і мароз, які не дазволіў гарадскім сваякам *запаліць машыну* і даехаць у вёску. Не ўсе спадзяюцца на гасцей. Таму тры бабулі самі адправіліся святкаваць да дзяцей у горад. Такія паездкі выклікаюць моцны стрэс у старажылаў.

— Бо толькі замінаеш ім, бедным, у гарадскіх пакоях, — кажа адна бабуля.

Калядаванне ў адміраючых вёсках парадаксальна паказалася пажаданым. Нідзе так як у такіх месцах людзі не сустракаюць калядоўшчыкаў.

— А я ўжо ад рання вас выглядаю, — сказала нам на прывітанне цётка Оля Вашчэнка. — Дай Божа вам здароўечка! Што не абмінулі! Не паганьбавалі!

Старажылка шчодра нас абдарыла і правяла да брамы, аднак згодна з народнай мудрасцю, пабаялася нас хваліць.

— Соль табе ў вочы! — сказала яшчэ ў свой адрас.

Маладыя смяяліся, я цешылася з-за жывых каларытных слоў, успамін ад якіх доўга грэе душу. Раней цёця Оля ў сваім шчырым захапленні назвала нас кветачкамі і пацёрачкамі...

Газстрым

☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

„Газпрам" — гэта не Гальфстрым. Толькі Гальфстрым можа сабе дазволіць задарма і вякамі абагравацъ паўночную частку еўрапейскага кантынента. Што тычыцца расійскага „Газпрама", то той за абагрэў Еўропы патрабуе грошы. І не абы-якія, а менавіта еўрапейскія. І не ўва ўсіх, а толькі ў тых еўрапейцаў, якія паспелі аб'яднацца пад дахам адзінай валюты еўра ў краіне з назвай сугучнай той валюце...

Цуд чыстаты

☞ 2

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Нейкі час таму пракацілася па свеце каціроўка розных г.зв. цудаў свету. Былі прыгаданы цуды старажытныя і былі абнародаваны вынікі нейкага сучаснага апытання пра цуды цяперашнія. І былі таксама ацэнкі некаторых цудаў у рамках дзяржаўных межаў, напрыклад, з'явіўся рэйтынг незвычайнасцей у Злучаных Штатах Амерыкі...

З гісторыі беспрацоўя ў Гайнаўцы

☞ 3

Аляксей МАРОЗ

Гайнаўскі цэнтр дапамогі і адукацыі

☞ 4

Уладзімір СІДАРУК

„Гісторыі..."...

☞ 5

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

9 770546 196000

Газстрым

„Газпрам” — гэта не Гальфстрым. Толькі Гальфстрым можа сабе дазволіць задарма і вякамі абагараваць паўночную частку еўрапейскага кантынента. Што тычыцца расійскага „Газпрама”, то той за абагрэў Еўропы патрабуе грошы. І не абыякія, а менавіта еўрапейскія. І не ўва ўсіх, а толькі ў тых еўрапейцаў, якія паспелі аб’яднацца пад дахам адзінай валюты еўра ў краіне з назвай сугучнай той валюце.

Ну, а хто не паспеў туды ўцячы, то, як гаворыцца, самі вінаватыя. З такімі краінамі „Газпрам” хоча разлічвацца не ў еўра, і нават не ў расійскіх рублях. Гэтыя краіны павінны плаціць прыхільнасцю не толькі да Расіі і яе кіраўніцтва, не толькі да той палітычнай і сацыяльнай сістэмы, якая ёсць у сённяшняй Расіі, але, прайшоўшы шлях васальства і прыніжэння, павінны праз пакаянне прызнаць сваю віну перад „старэйшым братам” і завучыць галоўную „малітву” — „Навекі з Расіяй...”.

Ну, а калі „малітва” не засвоена, то акурат на Новы год расійскі Дзед Мароз з радасцю павіншуе „братоў малодшых”, паведаміўшы ім, што газу ў трубах больш не будзе. І калі хто хоча цяпла, то можа грэцца ў Гальфстрыме. Бо галоўнае адрозненне Дзеда Мароза ад Санта-Клаўса акурат у тым, што ён не можа змірыцца з існаваннем Святога Міколы і лічыць таго самазванцам.

На гэты раз Дзеда Мароза больш дапёк украінскі Святы Мікола. Хіба што ваяваць з абодвума „малодшымі братамі” ў рускіх ужо бракуе сіл. Ды і растлумачыць сваім суайчыннікам, што ўсе іх браты, і ўкраінцы, і беларусы адначасова аказаліся кепскімі, таксама не хапае аргументаў. Таму газавыя войны аб’яўляюцца па-чарзе — раз украінцам, другі раз беларусам; тым, хто год пражыў на думку Дзеда Мароза больш „грэшна”.

У гэтым годзе больш „грэшнымі” аказаліся ўкраінцы. Беларускае кіраўніцтва хоць не робіць, але ж абяцае разгледзець пытанне па прызнанню адабраных Расіяй ад Грузіі тэрыторый. Ды і дамова па агульнай супрацьпаветранай абароне таксама рэч не апошняя, бо абараняць яна будзе расійскае неба, а НАТАўскія ракеты будуць накіраваны на беларускую зямлю, дзе сістэмы гэтай „абароны” будуць размяшчацца. І накіраваны тыя НАТАўскія ракеты будуць акурат на тую зямлю, дзе неўзабаве будзе збудавана АЭС. Можа таму яе там і будуюць. Маўляў, стрэльніце па расійскіх сістэмах, то будзе ядзерны выбух у цэнтры Еўропы, які засыпле радыяцыйнымі элементамі ўсё аж да Гальфстрыма.

З эканамічнай кропкі погляду „Газпрама” гэта таксама нібыта не выгадна. Бо каму тады прадаваць газ? Але „Газпрам” даўно ўжо паказаў усяму свету, што ён не эканамічная адзінка, а палітычная. Таму яго кіраўніцтва і размаўляе адпаведнай рыторыкай. Дагаварыліся нават да таго, што Украіна не экспартуе расійскі газ па сваёй тэрыторыі, бо такім чынам вырашае свае палітычныя амбіцыі ў дачыненні да Расіі.

Каб гэтага выказвання не было, то яшчэ можна б было таму-сяму недасведчанаму і недавучанаму крыху паверыць, што сапраўды нешта там украінцы нядобра намудрылі. Але калі ідзе размова пра рэалізацыю палітычных амбіцый, то тут усё зразумела, бо ўсе народы былога СССР да Расіі маюць толькі адну „палітычную амбіцыю” — каб Расія ад іх адчапілася. Таму гатовыя ўцякаць хоць у НАТА, хоць у Гальфстрым, абы далей ад Расіі. І толькі тая заяўляе, што паўсюдна жывуць яе грамадзяне, і яна мусіць іх бараніць, лупцуючы і тых, што грамадзянамі Расіі так і не сталі, і тых, што мелі неасцярожнасць стаць такімі.

Еўропа гэта ведае, але маўчыць. Робіць выгляд, што разбіраецца хто там ваду муціць, рускія ці ўкраінцы. Прывычным да камфорту еўрапейцам цяпла Гальфстрыму ўжо мала, таму з „Газпрамам” канфліктаваць баяцца. Ды і прызнацца, што памыліліся некалі ў вызначэнні месца для Расіі, таксама не хочацца, бо былі ўпэўнены, што Расія будзе, як краіны Лацінскай Амерыкі, толькі прадаваць танную сыравіну, атрымліваць гуманітарную дапамогу ды маўчаць. Але сама Расія вырашыла, што не для таго яе кіраўнікі-тыраны будавалі крывавую імперыю, каб зараз есці з рук еўрапейскага гаспадара. Вось таму зараз увесь свет стаіць на вушах.

Адзіны хіба, каму няма справы да ўсіх гэтых праблемаў, гэта беларускі селянін. Ён, як і трыста гадоў таму, запрагае коніка, апранае кажух, бярэ сякерку і едзе ў лес па дровы. Добра завучыў ён за доўгія стагоддзі, што ніхто пра яго не падумае, ні „Газпрам”, ні Гальфстрым. У яго ёсць свой экстрым.

Віктар САЗОНАЎ

Цуд чыстаты

Нейкі час таму пракацілася па свеце каціроўка розных г.зв. цудаў свету. Былі прыгаданы цуды старажытныя і былі абнародаваны вынікі нейкага сучаснага апытання пра цуды цяперашнія. І былі таксама ацэнкі некаторых цудаў у рамках дзяржаўных межаў, напрыклад, з’явіўся рэйтынг незвычайнасцей у Злучаных Штатах Амерыкі. Вядома, гэтыя ўсе ацэнкі былі ў свеце ўспрыняты па-рознаму, не абышлося без крытыцызму. Паколькі мне ўдалося пабачыць адно амерыканскі рэйтынг, таму пакарыстаюся магчымасцю пакрытыкаваць той, які мне нейкае тамашняе цудалагічнае журы запрапанавала для захаплення. Былі там галоўным чынам дзівы прыроды, але не было ў пабачаным мною размеркаванні цудаў чалавечага вырабу, а здаецца ж, што менавіта яны, дасягненні амерыканцаў, павінны таксама займець месца ў такой ганаровай грамаце. І не на думцы ў мяне хмарачосы ці галівудская вытворчасць, але амерыканская дэмакратыя.

Вось у рамках гэтай дэмакратыі адбыліся там нядаўна прэзідэнцкія выбары, якія выйграў сенатар ад штата Ілінойс Барак Абама. Такім чынам новы прэзідэнт пакідае сваё сенатарскае крэсла, якое павінен заняць нейкі іншы прадстаўнік таго ж штата. Да часу новых сенатарскіх выбараў часовага сенатара назначае там губернатар, у даным выпадку губернатар штата Ілінойс. Калі так разглянуцца па свеце — хопіць дзеля гэтага зазірнуць у найбліжэйшае замежжа кругом Беластока — каб пабачыць, што ёсць яшчэ больш цуд ад амерыканскага, яшчэ больш дэмакратычная ад амерыканскай дзяржава, дзе ўсю прадстаўнічую палату на поўны тэрмін назначае адзін чалавек...

Але вярнуся ў згаданы Ілінойс. Цяпер губернатарам там 52-гадовы Род Благоевіч, у якога і родавае імя Міларад... Бацька Міларада, Радзіша Благоевіч, у вайну быў сербскім чэтнікам, які змаганне закончыў уцёкамі перад Цітавымі пераможцамі. Апынуўся ён у Злучаных Штатах, дзе стаў на працу сталяварам. Сям’і жылося небагата і малы Радзік вымушаны быў таксама зарабляць на хлеб. Калі б ён жыў у нашай вёсцы, ён можа падкрадаў бы яйкі з суседскіх куратнікаў і прадаваў у вясковай краме. Мяркую, аднак, што ў Чыкага, дзе жылі Благоевічы, геэсаўскіх крамаў не было і наш малы герой заняўся тым заняткам, з якога пачыналіся найбуйнейшыя амерыканскія кар’еры — ён стаў чысцільшчыкам абутку; не толькі слаўны Рокфелер заводзіў такім чынам чысціню ў Амерыцы. Падрастаючы Міларад — дзеля грошай на адукацыю — заняўся і змываннем посуду — тою працай, якую зараз праводзяць нашы выпускнікі ў эльдарадных краінах...

Здабыўшы адукацыю юрыста, Міларад ажаніўся з Патрыцыяй, дачкой Рычарда Меля, уплывовага дзеяча Дэмакратычнай партыі ў Чыкага. І паслаў цесць зяця на палітычную перадавую, дзе чэтнікаў сын у 1992 годзе стаў парламентарыем штата Ілінойс, у 1996 годзе быў абраны ў федэральную Палату прадстаўнікоў, а ў 2002 годзе бравурна ўзяў ілінойскі крэмль і ў 2006 годзе абараніў яго.

Але штат Ілінойс пракажоны карупцыяй. Гэта ў Чыкага працвітаў семдзесят гадоў таму найслаўнейшы падкупнік Аль Капоне. Губернатар 1961-1968 гадоў Ота Кернер сеў пасля на амаль год за хабарніцтва і махлярствы. Яго паслядоўнік з 1973-1977 гадоў Дэн Уокер сеў пасля на паўтара года за махлярствы і клятвапарушэнне. Непасрэдны папярэднік Благоевіча Джордж Рыян сядзіць ужо два з прысуджаных яму шасці з паловай гадоў за махлярствы і хабарніцтва. І Род Благоевіч палюбіў губернатарскую традыцыю, якая толькі падмацавала тую, якую прынёс у спадчынных балканскіх генах.

Благоевіч, арыштаваны 9 снежня і неўзабаве вызвалены, абвінавачваецца ў шэрагу правапарушэнняў. Гэта, м.інш., вымаганне ад інвестараў узносаў на яго выбарчую кампанію (ён ужо меціў у вашынгтонскую прэзідэнтуру) узамен за карысныя ім губернатарскія рашэнні. Гэта вымаганне ад газеты „Чыкага Трыбюн” выдварэння крытычна пішучых пра яго журналістаў. Гэта, у рэшце рэшт, задума гандлю сенатарскім крэслам, пакінутым новым прэзідэнтам. Пракуратуры пакуль не ўдалося адхіліць яго з губернатарскай пасады, але шлях да імпічменту адкрыты.

Змагаючыся за губернатарскі пост наш візантыйска-славянскі Міларад, які ў маладых гадах чысціў абутак і посуд, абяцаў таксама вычысціць забруджаны карупцыяй ілінойскі палітычны палетак пакінуты папярэднікамі. Неяк мне здаецца, што і наш Бацька абяцаў расправіцца з карупцыяй у сваім савецкім штаце; крытычную да яго прэсу ўдалося ўжо яму растурыць, відаць і іншыя аналагі, у тым ліку і месца Беларусі ў сусветным карупцыйным рэйтынгу. І ці ж можна сумнявацца, што беларуская дэмакратыя з’яўляецца не меншым цудам як амерыканская?

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Сіла ў ЕП

Ад добрых пару гадоў назіраю за палітычным жыццём, між іншым за польскім парламенцкім жыццём. Менавіта таму, што працую ў Беластоку, асабліва звяртаю ўвагу на тое, што робяць і гавораць лакальныя дэпутаты і іншыя тутэйшыя і родам адгэтуль, а заангажаваныя ў палітыку. Заўсёды з вялікай дозай увагі сачу за тым, пра што пытаюцца ў Сейме. Паколькі інтэрпеляцыі і дэпутацкія пытанні, як мне здаецца, з’яўляюцца адной з найважнейшых праяў публічнага жыцця парламентарыяў, галоўным чынам гэтых з правінцыі ды з другога і трэцяга партыйнага шэрагу. Стараюся пільна сачыць таксама за тым, пра што распытваюць і інтэрпелююць дэпутаты, звязаныя з беларускім (праваслаўным) асяроддзем. У гэтым тэрміне склікання такія „назіральныя пункты” ў мяне два. З’яўляюцца імі: Яраслаў Матвяюк (першы раз у сеймавай гісторыі) і Яўген Чыквін (дэпутат дасведчаны і вельмі заслужаны). Гэты апошні яшчэ нядаўна мяне задзівіў. Вось паставіў пытанне, накіраванае міністру замежных спраў наконт чутак аб ператварэнні часткі храма Агія Сафія ў Стамбуле, які ўфундаваў Юстыніян І Вялікі, у гандлёвы дом. Дэпутат Чыквін спытаўся ў міністра: ці падзяляе ён яго погляд, што храм (ад гадоў музейны аб’ект) з такой вялікай гістарычнай і рэлігійнай каштоўнасцю не павінен быць ператвораны ў гандлёвы дом і ці польскі ўрад намерваецца прымяніць нейкія меры дзеля таго, каб прадухіліць далейшае кашчунства над такім важным для хрысціян месцам і каб вярнуць там хрысціянскі культ.

Разумею клопат дэпутата і заадно рэдактара штомесячніка „Przegląd Prawosławny”, дзякуючы якому ўдалося ў свой час прафарсіраваць закон аб стасунках дзяржавы і Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. Толькі чаму пытанне Агіі Сафіі ў Стамбуле трэба ставіць якраз у польскім Сейме, а клопатам меў бы займацца якраз (толькі) польскі ўрад. Я падумаў сабе, што адрасатам павінны быць хутчэй арганізацыі, міжнародныя структуры, у імя — як разумею дэпутата Чыквіна — клопату за храм, які з’яўляецца таксама агульнахрысціянскай і звышнацыянальнай каштоўнасцю.

Ад імя МЗС адказаў віцэ-міністр Ян Баркоўскі. Адказаў, бо ці гэтага хацеў, ці не, усё ж мусіў. Заявіў: „Пытанне свабод і свабоды рэлігійных практык у Турцыі з’яўляецца пастаянным элементам, які абмяркоўваецца Еўрасаюзам у ходзе турэцкіх перамоў аб далучэнні, аднак у гэтым працэсе не паяўляецца з боку ЕС пастулат ператварэння музея ў Стамбуле ў аб’ект хрысціянскага рэлігійнага культу”. Згодна з яго інфармацыямі, атрыманымі ў пасольстве РП у Анкары і консульстве ў Стамбуле, „нельга пацвердзіць”, каб планавалася ператварэнне часткі Агіі Сафіі ў гандлёвы дом, а турэцкія ўлады не намерваюцца змяняць яго цяперашняга музейнага прызначэння. Адзначыў на канец, што „МЗС не бачыць падстаў, каб патрабаваць ад турэцкіх улад змен у функцыянаванні храма Агія Сафія”.

На маю думку, значна большую вырашальную сілу ў пытанні аб будучыні і ролі Агіі Сафіі ў Стамбуле меў бы дэпутат Яўген Чыквін у Еўрапейскім парламенце. Выбары ўжо сёлета! Тым больш, што з маіх інфармацый вынікае, што перамовы ЕС з Турцыяй аб далучэнні не завершацца так хутка. Можа еўрадэпутату Яўгену Чыквіну якраз шляхам дзеянняў у ЕП удалося б стамбульскаму храму, які „з’яўляецца спадчынай чалавецтва”, вярнуць хрысціянскі культ. Асабліва таму, што наконт гэтага МЗС у Варшаве аказалася быць ненайлепшым адрасатам.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

З гісторыі беспрацоўя ў Гайнаўцы

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Калі нашы продкі высякалі або выпальвалі лес і пасяляліся побач Белавежскай пушчы, нельга было гаварыць пра беспрацоўе, бо не хапала рук да працы, каб павырываць карэнне і падрыхтаваць зямлю для сельскагаспадарчага выкарыстання. Не менш работы было, калі трэба было апрацоўваць сваё поле і адрабляць паншчыну. Пазней людзі заўсёды знаходзілі работу ў лесе, у багацейшых гаспадароў ці ў панскіх маёнтках, але заробкі звычайных сялян былі вельмі мізэрнымі, а стандарт іх жыцця — вельмі нізкім. Сірот, калек і старэйшых нямоглых людзей, якія вандравалі паміж сёламі, неабходным для пражыцця хлебам успамагалі жыхары вёсак. Нашы гісторыкі заўважаюць, што стандарт жыцця прыпушчанскага насельніцтва выдатна паправіўся ў апошнім перыядзе царскага панавання, разам з паўсюднай адукацыяй, але людзі надалей найчасцей утрымліваліся з апрацоўкі сваёй зямлі або дадатковых сезонных заробкаў. Перад бежанствам у Расію, якое вельмі моцна зруйнавала нашу сельскую гаспадарку, некаторыя беларусы з нашых вёсак, атрымаўшы адукацыю, пераязджалі ў навакольныя гарады і станавіліся чыноўнікамі, настаўнікамі, а нават займалі кіраўнічыя пасады. Слова „беспрацоўе” паявілася з прыходам індустрыялізацыі, хаця адмоўныя яго паслядоўнасці можна было знайсці і ў ранейшых перыядах. Калі разглядаць прыпушчанскую тэрыторыю, дык будова вялікага дрэваапрацоўчага прадпрыемства ў пасёлку, які пачалі называць Гайнаўкай, распачалася ў час першай сусветнай вайны, а гайнаўскі тартак і прадпрыемствы, якія працавалі на яго патрэбы, разбудаваліся ў міжваенны перыяд. Тады таксама разгарнула сваю дзейнасць рамяство. Масавыя звальненні работнікаў у Гайнаўцы ў час сусветнага крызісу, што пракаціўся праз Польшчу ў 1930-х гадах, давялі да масавых забастовак у прыпушчанскім пасёлку і вялікага незадавальнення яе жыхароў. Калі паспрабаваць параўнаць прычыны беспрацоўя ў Гайнаўцы з трыццатых гадоў і тыя, якія давялі да звальненняў, што распачаліся на Гайнаўшчыне ў канцы 2008 года і працягваюцца ў 2009 годзе, то можна знайсці многа падобных фактаў. У выпадку запатрабавання на вырабы канкрэтнага прадпрыемства можа яно разгортваць прадукцыю і прымаць на работу працаўнікоў. Калі абмяжоўваецца попыт на прадукцыю, суполка скарачае размер сваёй вытворчасці і звальняе работнікаў, каб пратрымаць стагнацыю. Можна яшчэ высылаць работнікаў на бясплатныя водпускі, што масава рабілася ў час трансфармацыі ў постсавецкіх краінах і робіцца зараз у заходніх дзяржавах у час крызісу ў выбраных галінах эканомікі.

Звольненыя з працы асобы прыходзяць шукаць новую работу ў Павятовую ўстанову працы, але тут новых прапаноў мала ў параўнанні да патрэб

Калі не беспрацоўе, дык паслядоўнасці крызісу

Беспрацоўе ў Гайнаўцы з 1930-х гадоў толькі ў невялікай ступені кранула беларусаў у прыпушчанскіх вёсках, бо да крызісу складалі яны толькі невялікую частку гайнаўскіх работнікаў. Сярод працаўнікоў гайнаўскага тартака і спадарожных яму прадпрыемстваў асноўную частку складалі палякі, якія прыехалі сюды ў пошуках лепшага заробку. Масавая міграцыя насельніцтва польскай нацыянальнасці на тэрыторыю сённяшняй Гайнаўшчыны (бо пасяляліся яны ў розных месцах Белавежскай пушчы і на яе акраінах) у міжваенны перыяд хіба была самай вялікай, бо ў пазнейшы час лік прыезджых палякаў быў ужо даволі абмежаваны.

— У міжваенны перыяд цяжка было ўладкавацца на працу ў гайнаўскім тартаку маладым людзям з навакольных сёл, бо прымалі на работу ў галоўным прыезджых з Польшчы. Тлумачылі, што мясцовыя вяскоўцы не вельмі падыходзяць да працы пры апрацоўцы драўніны і ў выніку састаўлялі яны толькі каля 10% усіх працаўнікоў гайнаўскага дрэваапрацоўчага прадпрыемства, — удакладняе былы працаўнік гайнаўскага тартака (ужо пры народнай уладзе) Уладзімір Паскробка з Гайнаўкі. Старэйшыя жыхары падгайнаўскіх вёсак успаміналі, што маладому вясковаму хлопцу трэба было мець асаблівыя знаёмствы, каб знайсці працу ў гайнаўскім прамысловым пасёлку.

— Мне ўдалося ўладкавацца на працу ў гайнаўскім тартаку ў міжваенны перыяд, бо дапамог мне багаты паляк, які жыў у суседнім сяле і ў якога я раней працаваў, — расказаў мне старажыл з Койлаў.

У міжваенны перыяд маладых вяскоўцаў масава прымалі на працу ў пушчы, калі англійская суполка „Цэнтуры” масава высякала лес. Англійскія працадаўцы не глядзелі на паходжанне работнікаў і стараліся прыняць на работу многа людзей, каб як найхутчэй здабыць як найбольш лесу.

— У міжваенны перыяд у дрэваапрацоўчым прадпрыемстве ў Гайнаўцы бывала так, што людзі працавалі дзесяць месяцаў і за гэты час адкладвалі частку грошай у працадаўцы. Пасля ён на працягу двух месяцаў, калі рабочыя аставаліся дома, выплачваў з іх успамогу, — спадар Уладзімір Паскробка звяртае ўвагу на адзін са спосабаў абмежавання беспрацоўя ў Гайнаўцы. Аднак гаспадарчы крызіс 1930-х гадоў меў свой масавы адбітак і на мясцовых беларусах. Цяжка было ім прадаць сельскагаспадарчыя прадукты і да таго выдатна панізілася іх цана.

Працадаўцы шукалі работнікаў

Быў кароткі час, калі пры народнай уладзе беспрацоўе практычна не існавала, а чалавек, які траціў работу ў адным месцы, без асаблівых цяжкасцей знаходзіў яе ў другім. Выключэнне складалі людзі, якіх спецслужбы палічылі ворагамі народа. Іх прыніжалі і пакідалі без працы. Яны мусілі задаволіцца намнога горшай работай ад той, якую выконвалі раней („цяжкасці з работай” мелі вядомыя ў нас беларусы, напрыклад, Канстанцін Майсеня з Гайнаўкі ці Сакрат Яновіч з Беластока). Былі нават перыяды, калі працаздольным, якія заставаліся без работы, пагражала нават пакаранне.

Вяртанне да капіталістычных умоў гаспадарання ў пачатку дзевяностых гадоў было даволі хуткім і жорсткім (калі гаварыць пра самых работнікаў), што давяло да вялікага беспрацоўя не толькі ў Гайнаўцы, але і ў суседніх гмінах. Спачатку сацыяльная дапамога для беспрацоўных гайнавян давала магчымасць скромнага выжывання. Дапамагалі ім таксама бацькі, якія гаспадарылі на вёсцы. Некаторыя нават пераймалі гаспадаркі. Пасля беспрацоўе пачало меншаць, так як і дапамогі для беспрацоўных, скараціўся таксама час іх выплачвання.

Апошнімі гадамі беспрацоўе сярод фізічных работнікаў у Гайнаўцы амаль знікла. Нават маладыя людзі з вышэйшай тэхнічнай, юрыдычнай ці эканамічнай адукацыяй знаходзілі работу ў Гайнаўцы або наваколлі. Працу на мэблевай фабрыцы „Фортэ”, меншых дрэваапрацоўчых прадпрыемствах, машынабудаўнічых заводах, гайнаўскім „Гамеху” ці нарваўскім „Пронары” і ў паслуговых прадпрыемствах знаходзілі выпускнікі прафесійных школ. Апошнім яшчэ пяць-дзесяць гадоў таму цяжка было ўявіць, што так хутка могуць палепшыцца ўмовы на рынку працы. Іншыя за працай паехалі ў Беласток, Варшаву і іншыя вялікія гарады. Многа маладых людзей з Гайнаўшчыны выехала за працай у Вялікабрытанію, Ірландыю, Германію, Італію і іншыя заходнія краіны. Гэта ў сваю чаргу паўплывала на адмену сітуацыі на рынку працы. У 2007 годзе і першай палове 2008 года некаторыя прадпрымальнікі звярталіся да дырэкцыі Следчага арышту ў Гайнаўцы, каб падсылалі ім да фізічнай работы на менш адказных пасадах зняволеных, якія маюць права на працу па-за турмой. Прадпрымальнікі стараліся шукаць работнікаў па-за горадам, але ў некаторых выпадках надалей заставаліся вакансіі. Спадар Ян, які кіруе работай у будаўнічым рамонтна-аддзелачным прадпрыемстве яшчэ ў 2007 годзе вымушаны быў павышаць зарплаты сваім працаўнікам, каб тыя не пакінулі работы. Аднак колькасць маладых людзей, якія вярнуліся з-за мяжы, бо не хацелі там працаваць пры танных фунце і еўра, хутка ў Гайнаўцы большае. Многія з іх працавалі ў будаўніцтве і навучыліся выконваць рамонтныя работы, што было вялікім аблягчэннем для гайнавян, якія масава бралі крэдыты ў франках або злотых, куплялі старыя дамы да рамонту, будавалі новыя, а перш за ўсё рашаліся на куплю кватэр у блоках. За паўтара года цана за адзін квадратны метр кватэры ў блоку павысілася недзе ў тры разы і зараз у старым будаўніцтве трымаецца, залежна ад стандарту абсталявання памяшканняў, у межах 2,5-3 тысяч злотых.

Незадавальненне капіталістычнымі ўмовамі гаспадарання

Калі зараз ў Гайнаўцы выдатна пабольшала беспрацоўе, да якога ў вялікай ступені спрычыніліся звальненні работнікаў на мэблевай фабрыцы „Фортэ” і ў некаторых іншых прадпрыемствах, толькі частка звольненых асоб патрапіла знайсці новую працу. Іншым засталося кароткі час прымаць невялікую грашовую ўспамогу і надалей шукаць работу. Паявіліся фінансавыя клопаты і цяжкасці з канструяваннем сямейных бюджэтаў, якія дазвалялі б нармальна жыць. Частка звольненых пачала наракаць на капіталістычны лад гаспадарання і тужыць па сацыялізме. Зараз стандарт жыцця звычайных сямействаў намнога вышэйшы ад таго з мінулага і цяжка людзям, што астаюцца без працы, пракарміць сямейнікаў за сродкі здабытыя ўрыўкамі. Хаця ў Гайнаўцы няма масавых забастовак, якія былі ў 1930-х гадах, людзі без працы спадзяюцца на ўладу, якая можа ім дапамагчы толькі ў абмежаваны спосаб і таму застаецца расчараванне. Падобнае да таго, што было ў час крызісу 1930-х гадоў, бачым зараз і на нашых сёлах. Калі яшчэ ў мінулым годзе можна было прадаць пшаніцу па 800-900 злотых за тону, дык цяпер яна каштуе 400-450 злотых. Цана малака панізілася за год прыблізна на 30-40%, моцна патаннелі іншыя сельгаспрадукты.

(заканчэнне ў чарговым нумары)

Ляўкова зімою

Летам у 2008 годзе ў Новым Ляўкове (Нараўчанская гміна) праклалі новы тратуар. І вось прыйшла марозная і снежная зіма. З 3 на 4 студзеня г.г. загуляла мяцеліца. Усе дарогі і панадворкі засыпаў белы пух.

З студзеня радны Ляўкова Ян Целушэцкі заходзіў да аднасяльчан і мабілізаваў іх замесці тратуар. Амаль усе адкінулі снег з усяе сцежкі з брусчаткі. Раней радны сам даў добры прыклад. Гэтае было і ў нядзелю, 4 студзеня. У царкву можна было ісці па тратуары. Праўда, адзін з сялян не чысціў тратуара ні 3, ні 4, ні 5 студзеня. Затое Міраслава і Ян Стоцкія, Войтэк Баканач, Яўген Смольскі, Мікалай Лаўрэшук (солтыс), Тэрэса Саковіч (яна замяла і за непрысутную суседку), Аляксей Максімюк і Вольга Максімюк ды іншыя ўзорна адкінулі снег і замялі.

Важную справу зрабіў Давід Скепка (сын павятовага раднага Андрэя Скепкі), які сваім маленькім трактарам спіхнуў снег на вялікім адрэзку тратуара перш-наперш насупраць тых дамоў, у якіх гаспадары рэдка паяўляюцца ды каля злеўні малака, якую закрылі наглуха з пачаткам снежня мінулага года.

Дзякуй вам, аднасяльчане і заадно выбаршчыкі, за такі падыход да супольнай справы, за праяўленую актыўнасць. Гэта і прыклад для іншых вёсак. Гэта ж мы робім для сябе. Каб нам лепш жылося.

Старое Ляўкова

Арганізоўваюць Куццю ў святліцы

Вечарам 30 снежня 2008 года ў святліцы ў Старым Ляўкове (Гайнаўскі павет) арганізоўвалі Куццю для ўсіх ахвотных жыхароў Ляўкова і навакольных вёсак. Прыйшлі на яе настаяцель Стараляўкоўскага прыхода а. Леанід Янкоўскі, радныя Ян Целушэцкі і Юры Равінскі, прыхаджане ды члены царкоўнага хору. Са сцэны ўсіх радавалі звязда і ёлка з каляровымі агеньчыкамі.

Айцец Леанід Янкоўскі расказаў пра гісторыю Ражджаства Хрыстовага і падзякаваў усім за падтрымку традыцыі Куцці. Светліцовая Галена Марыёля Рэент арганізоўвае Куццю ўжо восьмы год: чатыры разы, калі працавала ў мясцовай школе, і чатыры разы ў святліцы.

Пасля ўсе за доўгім сталом (прыйшло многа людзей) частаваліся посными стравамі, якія рыхтуюць на Куццю. Перад пачастункам усе ўзялі просвірню ды згаварылі малітву „Отча наш".

Вечар калядак працягваўся больш трох гадзін. Сабраныя агледзелі аматарскі кінафільм з мінулагодняга такога ж мерапрыемства. Дарослыя і дзеці праспявалі дванаццаць самых прыгожых калядак, м.інш., „Раджаство Хрыстова", „Нова радасць стала", „Ноч у Віфлеме", „Учора з вячора", „Ой, па моры, моры", „Скінія златая", „Святая Варвара", „Бог се рождает". Так усе славілі Ісуса Хрыста.

(яц)

Гайнаўскі цэнтр дапамогі і адукацыі

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

У Гайнаўцы, па вуліцы Пілсудскага 10А, змяшчаецца Павятовы цэнтр дапамогі сям'і. Гэтая ўстанова — самастойная бюджэтная адзінка павятовага самаўрада, над якою нагляд вядзе староста. Сфера дзеяння цэнтра даволі шырокая. У палове снежня мінулага года наведаў я асяродак ды пагаварыў з загадчыкам Цэнтра. Вось што сказаў мне кіраўнік ПЦДС Павел Шыманюк.

— Павятовы цэнтр дапамогі сям'і працуе са студзеня 1999 года. Раней справамі сацыяльнай дапамогі і праблемамі інвалідаў займаліся гмінныя і ваяводскае аддзяленні. У час аднаўлення паветаў узнікла патрэба стварыць адпаведнік для павятовых структур; у выніку быў заснаваны Павятовы цэнтр дапамогі сям'і, задача якога зводзілася да двух абшараў: апека над сям'ёй і дзяцьмі ды дапамога асобам з абмежаваннямі. У 2005 годзе прыбавіліся справы насілля ў сям'і.

На Гайнаўшчыне функцыянуе 49 часовых сем'яў, у якіх знаходзіцца восемдзесят двое дзетак. Большая частка з іх працуе ў самім горадзе (2/3), апошнія размешчаны на тэрыторыі павета. Толькі ў гміне Чыжы і Дубічы-Царкоўныя няма ніводнай (у Чаромхаўскай гміне — чатыры). Паводле катэгорый часовыя сем'і раздзяляюцца на: а) сем'і параднёныя з дзіцём, б) сем'і непараднёныя з дзіцём і в) сем'і прафесіянальныя непараднёныя з дзіцём. Трыццаць тры сям'і з сарака трыма дзеткамі параднёныя, дваццаць двое дзяцей у дванаццаці сем'ях — непараднёныя, а сямнаццаць дзетак знаходзіцца ў чатырох прафесіянальных сем'ях. Варта адзначыць, што 25 выхаванцаў стала незалежнымі і карыстаюцца сацыяльнай дапамогай Цэнтра. За адзінаццаць месяцаў, г.зн. да канца лістапада мінулага года, часовыя сем'і і самастойныя выхаванцы пакарысталіся грашовай дапамогай Цэнтра на суму 837 082 зл. У гэтым перыядзе прыбавілася нам васемнаццаць дзетак.

Шматлікую і ўсебаковую дапамогу нясе наша ўстанова інвалідам. Каб пакарыстацца такой дапамогай, неабходна мець групу інваліднасці. Асоба з абмежаваннямі можа разлічваць на даплату пры карыстанні з курортнай рэабілітацыі, пры закупе артапедычных і рэабілітацыйных прылад ды дапаможных сродкаў. Такой жа дапамогай могуць пакарыстацца ўстановы і фірмы, якія ўдзельнічаюць у ліквідацыі архітэктурных і тэхнічных бар'ераў для асоб з абмежаваннямі. Для прыкладу:

— за адзінаццаць месяцаў мінулага года 412 асоб пакарысталася дапамогай курортнай рэабілітацыі на суму 249 204 зл. (у тым ліку 118 жыхароў вёсак — 74 535 зл. ды 29 дзетак і моладзі з абмежаваннямі — 19 720 зл.);

— 395 інвалідаў атрымалі 235 979 зл. кампенсацыі за пакупку рэабілітацыйных прылад і дапаможных матэрыялаў, пачаўшы ад інвалідных калясак і канчаючы на падгузніках, якімі пакарысталіся 132 асобы на суму 37 331 зл. Абгрунтаваннем для атрымання дапамогі Цэнтра пры індывідуальных закупках з'яўляецца дафінансаванне з Нацыянальнага фонду здароўя.

У ліквідацыі архітэктурных і тэхнічных бар'ер удзельнічала пятнаццаць асоб, якім цэнтр кампенсаваў 81 757 зл. Прыстасаваны былі дзевяць купальняў, тры пад'езды, былі куплены два дамкраты (пад'ёмнікі), двое невідушчых атрымалі дапамогу пры закупцы агучваючай праграмы для тэлефонаў.

У рамках праграмы спорту, культуры, адпачынку і турызму ўдзельнічалі тры таварыствы, якія арганізавалі дзевяць мерапрыемстваў для асоб з абмежаваннямі, якіх кошт (7 688 зл.) быў кампенсаваны нашым Цэнтрам. Варта адзначыць, што на тэрыторыі Гайнаўшчыны працуе майстэрня работатэрапіі, у якой займаецца 23 інвалідаў. На гэту мэту выдадзена 315 838 зл. са сродкаў Дзяржаўнага фонду рэабілітацыі асоб з абмежаваннямі.

Пры Цэнтры дзейнічае Кансультацыйны пункт з Пунктам даступнасці да грамадзянскага кансультавання анлайн. Працаўнікі ў час працы абслугоўваюць кліентаў па сацыяльных пытаннях, падказваюць як аформіць справу. Апрача таго па чацвяргах з 9 да 11 гадзіны дзяжурыць кансультант Бюро грамадзянскіх парад у Ломжы (Biuro Porad Obywatelskich), які аказвае юрыдычную дапамогу ў сферы кансультацыі анлайн для наведвальнікаў з Гайнаўшчыны. Кліенты могуць разлічваць на падтрымку пры вырашэнні сямейных спраў, хадайніцтве за кватэрай, сацыяльнай дапамогай, у справах працы і беспрацоўя ды насілля ў сям'і. Варта адзначыць, што кансультацыі даюцца бясплатна, прытым захоўваецца сакрэтнасць, верагоднасць і незалежнасць. Сутнасцю справы з'яўляецца тое, што пры вырашэнні спраў выпрацоўваецца магчымасць кампрамісу, прычым канчаткова выбар рашэння застаецца на баку кліента. Незалежна ад Кансультацыйнага пункта ад верасня быў арганізаваны Павятовы цэнтр крызіснай інтэрвенцыі. Патрэбу заснавання такой адзінкі бачыла Праўленне павета. Асяродак крызіснай інтэрвенцыі дзейнічае ў трох абшарах: псіхалагічная ды юрыдычная дапамога і праца ў сацыяльнай сферы. Кліенты могуць разлічваць на дапамогу шматлікіх спецыялістаў (м.інш. з асяродкаў сацыяльнай дапамогі, калектываў медыцынскай экспертызы па справах інваліднасці, ЗУС, КРУС, школ, прадшколляў, паліцыі, судоў, асяродкаў здароўя).

Важную ролю, — канстатуе кіраўнік ПЦДС Павел Шыманюк, — выконвае Цэнтр пры стаўленні дыягназа асобам, якія хадайнічаюць за памяшчэнне ў Доме сацыяльнай апекі ў Белавежы. Дзеля гэтага супрацоўнічаем з Павятовым асяродкам падтрымкі ў Гайнаўцы і дапамагаем пры камплектаванні дакументаў. Нясем адукацыйную інфармацыю падапечным у справах сацыяльнай дапамогі, інваліднасці і насілля ў сям'і.

Ці будзе фабрыка мэблі?

Ад звыш дзесятка гадоў, калі ў Орлі была зліквідавана бетанярня, а яшчэ раней кафлярня і цагельня, мясцовасць страціла прамысловы характар. Жыхары Орлі і навакольных мясцовасцей тужаць па мінулым, не толькі за месцамі працы, але і за працяглай традыцыяй мястэчка, у якім бурліла жыццё. Таму ўсе тут з вялікай увагай успрымаюць весткі пра магчымасць адраджэння гэтай традыцыі.

На лістападаўскай сесіі Павел Себясевіч, солтыс Спічкоў, пацікавіўся ў войта магчымасцю пабудовы вялікай фабрыкі мэблі. Войт Пётр Сэльвесюк адказаў:

— Калі гаворка пра пабудову завода фірмы „Ikea", дык спярша было 17 лакалізацый на тэрыторыі Падляшскага ваяводства. Канчаткова асталіся дзве: адна насупраць Падбелля каля перасячэння дарогі ў гэтую вёску з краёвай, а другая ў Кляшчэлеўскай гміне пры выездзе ў Чаромху.

У завершаным відзе завод мае займаць плошчу каля сотні гектараў і даць працу тысячы двухсот асобам. Фірма шукае блізкага да краёвай дарогі і чыгуначнай лініі месца; згаданыя лакалізацыі задавальняюць гэтыя патрабаванні. Мяркуецца, што кошт пабудовы фабрыкі складзе каля двухсот мільёнаў еўра. Калі б удалося гэта паставіць у нашай гміне, за што рупліва хадайнічаю, было б вельмі добра. Былі б працоўныя месцы і двухпрацэнтныя падаткі, а гэта дастаўляла б у бюджэт 12-13 мільёнаў злотаў штогод, бо зараз наш бюджэт парадку 7-8 мільёнаў.

У чым заключаецца зараз галоўны наш клопат? Былі ўжо наладжаны дзве сустрэчы з уладальнікамі грунтаў, якіх разам каля дваццаці асоб, якія падпісалі ўступныя дэкларацыі, што згаджаюцца іх збыць у карысць фірмы „Ikea" з агаворкай, што цана задаволіць абодва бакі.

18 лістапада гутарыў я з дырэктарамі фірмы „Ikea" на Польшчу, спадзяемся ў Польшчы спадара Шварца, адказнага за інвестыцыі фірмы, будуць размовы пра цану грунтаў, якую фірма зможа заплаціць. Калі ўладальнікі зямлі дагаворацца з фірмай „Ikea", на што разлічваю, то фабрыка паўстане. Мае яна быць завершана ў 2011 годзе, пад 50-годдзе дзейнасці фірмы ў Польшчы.

Калі б удалася фабрыка і ветракі (ветравыя электрастанцыі на гмінных узвышшах — М. М.), дзе частка сялян падпісала ўжо дамовы аб арэндзе грунтаў, то не было б у гміне такіх праблем, спрэчак за пяць злотаў ад гектара (мова пра падаткі — М. М.), адно быў бы клопат як талкова расходаваць тыя грошы, каб іх не растраціць.

Хацеў я даведацца, што пра новую фабрыку мяркуе насельніцтва Орлі, але ніхто з апытваных мною асоб пра яе нават не чуў і — прызнаваліся — цяжка ім у такое паверыць.

Хацеў я таксама больш пра справу даведацца ва Управе гміны, але яе працаўнікі адказвалі мне, што падрабязнасці ім невядомыя, ведае іх толькі войт.

Астаюся аптымістам і спадзяюся, што, калі не цяпер, то ў будучыні загляне сонейка і ў Орлю.

Міхал МІНЦЭВІЧ

„Гісторыі...” ад Скарпіёна

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Поўны таемнасці, містыцызму, зменлівых эмоцый, адчаю, кемлівасці і фантазіі. Гэта моцная індывідуальнасць — так пра Скарпіёна, адзін са знакаў Задыяка пісала адна агульнапольская і з немалым уплывам на масавую думку газета. У гэтым знаку нарадзілася Міраслава Лукша, аўтарка нядаўна выдадзенага тома апавяданняў „Гісторыі з белага свету” свайго восьмага зборніка.

Скарпіёнавыя рысы характару аўтаркі прабіваюцца ў больш за сарака апавяданнях-абразках з сузіранай ёю рэальнасці, якая не заўжды згодная з гэтым усім, што здарылася сапраўды. Гэта такія — прымяняючы мастацкую мову — *павідокі* ад падзей, сустрэч з людзьмі, падглядванне іхніх паводзін і адносін паміж імі.

— Гэта гісторыі з белага, значыць, беларускага, калябеластоцкага свету, якія фактычна трапляліся на працягу апошніх пару гадоў. Гэта тутэйшы, рэальны, белы свет.

У размове аб сваёй найнавейшай кнізе дадае:

— Гэта не так, што бяру я ліст паперы, сядаю і вось так сабе пішу. Найперш накопліваюцца ўва мне эмоцыі, уяўляюцца карціны. Пэўна, яшчэ да напісання тэксту ён ува мне ўжо існуе, можа нават існуе недзе сам па сабе, а аўтар толькі яго прыпамінае?.. Хопіць, каб нешта ўкалола мяне знутры, каб тыя карціны ператварыліся ў „папяровы” тэкст.

Зараз пасля дакідае:

— Я — з Пушчы. Гэта з ваколіцы, дзе невядома дзе канчаецца мой луг, маёй бярэзінай пачынаецца пушча. Я не баюся гушчыні лесу, але і не баюся людзей. Не думаю, што хтосьці мяне хоча зманіць. Проста слухаю, але ж і не планую, што пра гэта напішу. Гэта была б якаясь анамалія — прыслухоўвацца, узірацца, каб пра гэта напісаць. Проста, прыходзіць момант, калі тое, што ўва мне засталося, трапляе на паперу.

У завяршаючым зборнік абразку „Дарога над Нарвай, якой няма” піша „ўколатая” аўтарка: *Дарога кладзецца як хлеб, уежна, улежна, у руку мне, да ног дакранаецца, да ступакоў маіх усё малых, падкурчаных ад адбеглай пожні і пакалечаных зялёным шклом майго незаўважнага дзяцінства. Зарастае след каня, капыціцца капытнікам шлях забыты, шэры, а дрэвы нахіляюцца з увагай нада мною — пазнаюць, можа, заўважаюць мяне як божую кароўку, ага, пазнаюць мяне па чырвонай сукеначцы ў чорныя гарохі? Я іх не пазнаю, не памятаю.*

Пісьменніца прызнаецца таксама:

— Можа, небяспечная гэтая мая „разяватасць”, тое заглядзенне ў тое што навокал, на ўсім гэтым белым свеце. Бывае, што кранае мяне гэта проста матэрыяльна, губляецца недзе мяжа рэальнасці і нерэальнасці, майго і немайго.

Некторыя з яе апавяданняў спасылаюцца на здарэнні, якія адбываліся ў неіснуючай ужо, а культавай кавярні „Маршанд”, дзе можна было сустрэць амаль увесь мастацкі беластоцкі эстаблішмент, дарэчы, таксама і аўтарку „Гісторый...” Прызнаецца яна, што сярод апублікаваных у зборніку гісторый найбліжэйшая ёй — „Футбол”, як могуць дадумацца набліжаныя, дзе прыгадвае сабе здарэнне з „Маршанда”:

— Настрой гэтай гісторыі застаўся ўва мне да сёння і са мной падобная гісторыя, як з героем апавядання, прытрапілася. Тут нават запіс маёй сустрэчы з героем з-пад Ялоўкі — рэальны.

Ёсць у найнавейшай кнізе Міраславы Лукшы апавяданні памежныя з казкай з яе быццам бы фальклорным характарам, спачатку ўводзячыя чытача ў амаль містычны, фантастычны свет, дзе прырода нераздлучна звязаная з простымі людзьмі. Гэты прыём з'яўляецца тыповым, як калісь сцвердзіла прафесар Марыя Янён, для літаратурнай ментальнасці беларусаў і такое мышленне м.інш. упісвае Міраславу Лукшу ў беларускі літаратурны канон. Аднак у яе тая беларуская, фантастычная мера ламаецца пад уплывам рэальнасці сучаснай беларускай вёскі і жыцця з пералому XX і XXI стагоддзяў. Апавяданне „Каліна” пачынаеца: *Цвіце каліна пад маім акном, — заспявала ў душы Антося штосьці як з нейкай праславянскай песні, бы ў генах тое азвалася. Млосны пах калінавых кветак датклiва ўскалыхнуў Антосеву душу, заныў у яго вантробах. Не пасуе каліна да сівухі, папахваючай жыткам. Няма гармоніі. І тут Антосю стала зусім блага і ён, перавесіўшыся за акно, апаганіў зямельку родную пад калінавым кустом тым, што дакучала ў яго нутры. Шкада таго дабра, што выпіў і закусіў.*

У сваю чаргу ў яе апавяданне „Дзед і баба” чытач уводзіцца такім чынам: *Прыехаў Пракоп з вёскі да дачкі. Дачок у яго чатыры, тры замужам, і сын на вёсцы, кавалер. Беластоцкая дачка патрымала яго два дні, але што старому рабіць — увесь час хата пустая, унукі ў школе, дачка на працы... Зараз і цямнее... Рашыў Пракоп знайсці занятак. Перш за ўсё знайсці цёплую кабету, бо ж халады ідуць. Першую падчапіў пад крамай саракагадовую выкладчыцу матэматыкі. Нічога, што ён сам з 1935, але выгляд у яго някепскі яшчэ, чупрына, хоць сівая, усё ж буйная, на амаль што юнацкім, румяным твары ледзь прыкмеціш змаршчыну. А калі цемнавата, дык увогуле ён маладжавы, стройны дзядзька...*

— Пэўна ёсць тут і апавяданні, якія не пасуюць да ключа. Ёсць тры сатырычныя тэксты і два апавяданні з цыкла г.зв. бабскіх гісторый, — прызнаецца сама аўтарка, якая выдала гадоў восем таму том апавяданняў, які карыстаўся немалой папулярнасцю — „Бабскія гісторыі”, як і раней некалькі зборнікаў прозы, сярод іх вядомы том „Дзікі птах верабей”, а таксама вершаў.

Першы галоўны рэдактар „Нівы”, а заадно мадэратар журналісцкай дзейнасці Міры Лукшы (ад пару гадоў таксама складальніцы папулярных ніўскіх гараскопаў) — Георгій Валкавыцкі напісаў у пасляслоўі „Гісторый...”: *Аўтарка сямі літаратурных зборнікаў заглыбляецца і адкрывае душу чалавека пагранічча, прабуе апісаць месца і час, якія заўжды былі незвычайнымі і складанымі, а тым больш цяпер, калі на нашых вачах радыкальна мяняецца рэчаіснасць. Якраз спробам знайсці сябе ў гэтай новай рэальнасці, спробам захавання традыцыі бацькоў героямі, тыповымі ў сваёй разнароднасці прысвечаны гэты зборнік. Не ёсць гэта аднак іконы, напісаныя жыццём, а хутчэй спроба эскізаў у руху, у зменлівасці.*

„Гісторыі з белага свету” выдала Беларускае літаратурнае аб'яднанне „Белавежа”, якога сяброўкай Міра Лукша з'яўляецца ад 35 гадоў. Зышлося гэта з юбілеем 50-годдзя з дня нараджэння аўтаркі, што асабліва ўрачыста было адзначана на апошніх польска-беларускіх літаратурных сустрэчах „Бязмежжа” ў прыпушчанскім хутары Новага Ляўкова.

Міра Лукша, аўтарка з другога пакалення беларускіх літаратараў у Польшчы, як і іншыя сябры БЛА "Белавежа", бесперарыўна дзейнічаючага ў Польшчы ад паўстагоддзя, кіруецца сямі ўласнай тоеснасці. Аўтарка сямі літаратурных зборнікаў заглыбляецца і адкрывае душу чалавека пагранічча, прабуе апісаць месца і час, якія заўжды былі незвычайнымі і складанымі, а тым больш цяпер, калі на нашых вачах радыкальна мяняецца рэчаіснасць. Якраз спробам знайсці сябе ў гэтай новай рэальнасці, спробам захавання традыцыі бацькоў героямі, тыповымі ў сваёй разнароднасці прысвечаны гэты зборнік. Не ёсць гэта аднак іконы, напісаныя жыццём, хутчэй спроба эскізаў у руху, у зменлівасці. Героямі з'яўляюцца людзі маладыя ды стомленыя жыццём, гэтак званыя "простыя", а ўсё ж прабуючыя пазмагацца са светам, гэтым белым, значыць, па-беларуску нашым, такім, у якім прыйшлося нам жыць прыгожа ці нягожа, змагаючыся не заўжды чыста і сумленна, каб апынуцца сярод тых хто ў выйгрышы. Тутэйшы свет на навароце гісторыі прадстаўлены і з гумарам, але і не без чуласці ды рамантызму.

Георгій Валкавыцкі

Ёсць такі дзень...

Дзень, звыклы дзень, калі гаснуць усе спрэчкі. Ёсць такі дзень, калі радасць вітае ўсіх... Гэта дзень Ражства Хрыстова.

У гэты дзень, трэці год запар, наш узорны клуб аматараў фальклору „Катрынка” з г. Высокае Камянецкага раёна сустракае разам з гмінай Кляшчэлі Ражство Хрыстова. Вось і ў мінулым годзе, 21 снежня, наш клуб прымаў удзел у экуменічнай вігілійнай вячэры. Дзеці разам з дарослымі падрыхтавалі вершы і песні пра Ражство Хрыстова, зрабілі прыгожы вяртэп, да якога па сцэнарыю „прылятае анёл з радаснай навінай”. Усе, хто прысутнічаў на вячэры, разам спявалі, маліліся і прасілі:

Благаславі Божа і гэты Новы Год,
Каб усе людзі зямлі здаровымі
і шчаслівымі былі.
Ты даў нам адраджэння
Анёла на спасенне,
Каб бярог нас ад грахоў,
Каб з усімі была згода і любоў.
Благаславі і Ты, Маці Прысвята,
Каб радзілі пшаніца і жыта,
Каб не было голаду і вайны,
Ад агню і бяды Ты нас абарані.

А потым усе дзяліліся прасфорай і аплаткамі з найчысцейшымі пажаданнямі шчасця, здароўя і любві, частаваліся поснымі стравамі, прыгатаванымі ўдзельнікамі вечарыны. І завяршылася вечарына агульным спяваннем калядных і святочных песень. Прыязджайце ў Кляшчэлі на экуменічную вячэру ў 2009 годзе. Вас тут сустрэнуць з радасцю!

А 28 снежня на Беларусь прыязджалі госці з Кляшчэль: дзеці і працаўнікі Дома турызму і культуры „Гладышка” разам з Марыяй Клімовіч. Яны наведалі Брэсцкую крэпасць, галоўную ёлку Брэста. У Цэнтры маладзёжнай творчасці глядзелі навагодняе прадстаўленне і пазнаёміліся з творчасцю дзяцей на абласной выставе мяккай цацкі „Зімовая казка”.

У Высокім наведалі выставу мастака Міхаіла Карпука, навагодні раніштнік для гурткоўцаў. Прысутнічалі на пашыраным пасяджэнні Камянецкага раённага культурна-грамадскага аб'яднання „Спадчына”.

Людміла ДУДАР
Старшыня праўлення Камянецкага раённага культурна-грамадскага аб'яднання „Спадчына”

На небе зорка

(калядка)
На небе зорка ясна заззяла,
і любым светам сіяе.
Хвіля збаўлення нам воссіяла,
Бог у Віфлееме раджае.
Каб землю з небам у адно злучыць.

Хрыстос радзіўся – слаўце!
Хрыстос радзіўся – слаўце!

У бедным Вярцепе ў яслях на сене,
спачыў Уладыка Цар свету.
І вось да яго спяшым усе зараз,
ад нас чакае прывету.
Спяшым любоўю, цяплом сагрэты.

Хрыстос радзіўся – слаўце!
Хрыстос радзіўся – слаўце!

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Казкі з Белавежскай пушчы

Зайчык Філіпок

Першы снег выпаў летась рана. Яшчэ дрэвы не скінулі сваіх сухіх лісцяў, як на зямлю паляцелі белыя пушыстыя сняжынкі. Занепакоіліся лясныя звяры. Не ўсе з іх загадзя падрыхтаваліся да зімы. У вавёрачкі заставаўся няўцепленым домік-дупло. Мядзведзь бадзяўся па лесе, нагульваў тлушч і не спяшаўся ў бярлогу на зімовую спячку.

У зуброй толькі-толькі пачала адрастаць больш густая поўсць. А самым збянтэжаным ад нечаканага прыходу зімы быў зайчык Філіпок. Яму ў адрозненне ад іншых звяроў патрэбна было тэрмінова мяняць летняе шэрае футра на зімовае белае, інакш ён станавіўся лёгкай здабычай як драпежнікаў, так і паляўнічых.

Узрадавалася густому іскрыстаму снегу толькі лісіца. Яна выслізнула са сваёй норкі, замяла за сабою рыжым пушыстым хвастом дарожку і, аблізваючыся, падалася ў глыб пушчы. Куманька ліса добра ведала, што самы час паласавацца свежай зайчацінкай. Яшчэ ўчора ён быў амаль нябачны ў сваім шэрым убранні на фоне пажухлай травы. Сёння ж тлусценькі зайчык ад яе не схаваецца. Цёмная вопратка на белым снезе выдасць яго з галавой. Так думала рыжая драпежніца, адпраўляючыся на паляванне.

Між тым не драмаў і Філіпок. Ён хуценька дастаў фарбу і пэндзаль ды стаў фарбаваць сваё футра ў белы колер. Пакуль заячы кажушок падсыхаў, выглянула сонейка, павеяў ветрык і снег на вачах ператварыўся ў лужыны. Дрэвы атрэслі апошнія іголкі інею і лес зноў апынуўся ва ўладзе восені.

Высунуў зайчык свой дапытлівы носік на вуліцу і жахнуўся: як жа ён у сваім бялюткім футры ў лесе з'явіцца? Яго ж ліса за вярсту ўбачыць. Ды і шуляк, таго і глядзі, схопіць небараку ў моцныя кіпцюры, з якіх вырвацца амаль немагчыма. Шэрай фарбы ў зайчыка няма, яе прынясуць толькі ранняй вясной пералётныя птушкі, якія вернуцца з-за мора. Што цяпер рабіць беднаму зайчыку? Каго прасіць паратунку? Давайце, дзеці, дапаможам лясному жыхару і разам пашукаем выйсце са становішча, у якім апынуўся наш Філіпок.

Таіса СКУРАТАВА

Павел Шуканаў, 13 гадоў. Спаса-Еўфрасіннеўская царква

Міра ЛУКША

Сава з Савінага Груда

Насупоніўся, надуўся
Ды ў другі бок адвярнуўся.
Гэта ж Сава, ён — сава,
Кажуць, „Мудрагалава".
А чаго ж надзьмуты ходзіць
Ён па снезе ды па лёдзе?
Спешыўся, бо ж паспяшыўся,
І крылом аб слуп разбіўся!..
А ляцеў з Сарочай Ножкі
Да свае сяброўкі-цёзкі,
Савы Саўкі, бо ж з якою
Мелі паляцець удвое.
Вось падумаў, пэўна, Сава,
Што пабіць крыло — не слава,
І жартуем мы з савінай
Крыўды не такой адзінай!
Дзе адна бяда — другая
Неўдалоціка чакае:
Сава Сава гуз набіў
І дарогу памыліў.
Няма чаго рагатаць!
Трэба Саву шкадаваць!

Карнавальны аркестр сэрца!

Фота Ганны Кандрацюк

Выступаюць хлопчыкі з Нарвы

Ужо семнаццаты год запар у Польшчы праходзіць дабрачынная акцыя Вялікага аркестра святочнай дапамогі. 11 студзеня, у нядзелю, на вуліцы Беластока выйшла каля 600 валанцёраў. У гэты дзень іх можна было сустрэць літаральна ўсюды — на вуліцах горада, ля касцёлаў і цэркваў, у аўтобусах і магазінах... Упершыню, на працягу гадоў, сцэну арганізавалі ў цэнтры горада, ля ратушы. Тут ішлі выступленні музычных гуртоў, рыцарскія турніры, на пляцы паставілі басейн для *маржоў* — дзядзькоў, якія купаліся ў ледзяной вадзе.

У восем гадзін вечара феерверачную справаздачу з беластоцкага рынку паказвала агульнапольскае тэлебачанне. Яшчэ ніколі так каларытна не выглядала трансляцыя са сталіцы нашага рэгіёна. Людзі адкрываліся на іншых, шчыравалі, радаваліся падзеяй. Праўда, сярод атракцыёнаў нам не хапала тут беларускіх акцэнтаў, якія раней узбагачалі праграму!

Вялікі аркестр звычайна адбываецца ў першую нядзелю пасля праваслаўных Каляд. Цягам гэтага тыдня ў цэрквах моляцца ад зайздроснага Ірадавага племя, якое ад вякоў атручвае добрыя і шляхетныя памкненні і справы. І нягледзячы на процьму ядавітых каментарыяў у інтэрнэце, мы можам гаварыць пра калядную перамогу. У гэтым годзе валанцёры сабралі рэкордную суму — больш за 32 мільёны злотых. У самім Беластоку назбіралася каля двухсот тысяч злотых. Падобныя акцыі прайшлі ў Гайнаўцы, Саколцы, Бельску-Падляшскім. Сярод валанцёраў мы сустрэлі многа моладзі і дзяцей. Апошнія хадзілі разам з бацькамі. Гэта абнадзейвае на будучыню — акцыя не згасне і цягам наступных дзесяткаў гадоў будзе папаўняць радасны настрой карнавалу. Варта падумаць, каб падобныя акцыі-святы праходзілі і ў Беларусі!

ЗОРКА

Зося з першага „а” класа

— 14 —

Напрыканцы старога года ў Зосі з'явілася праблема. Дзяўчына патрабавала вечаровы касцюм на наваго́днюю сустрэчу. Імпрэзу для класа арганізаваў іх сябра Пеця. Хлапец узяў на свае плечы ўсе цяжкасці, аднак паставіў адно жаданне:

— Каб кожны з вас здзівіў мяне сваім вечаровым касцюмам!

Зося абышла ўсе модныя крамы ў сваім горадзе, але нідзе не сустрэла адпаведнай сукенкі. Яна была прыгнечана. Заўтра навагодняя ноч, а ў яе няма касцюма. Хоць ты сядзь і плач!

У паваротнай дарозе дзяўчына наведала яшчэ адзін секенд-хенд. Там яна пабачыла сукенку, якая адразу яе захапіла. Яна была якраз на Зосю. Дзяўчына вярнулася дахаты на лёгкіх нагах.

Навагодні баль пачаўся ў восем гадзін вечара ў доме Пеці. Хлапец запрасіў увесь першы „а” клас. Сама імпрэза напамінала вечарыну для жаўнераў, паколькі на ёй апрача Зосі і Клары былі адны хлопцы. На дадатак Клара ўвесь вечар была ў дрэнным настроі. Яна не магла дараваць, што ў Зосі прыгожая сукенка.

— Я бачыла такую сукенку ў самым прэстыжным магазіне ў Варшаве, — сказала фарбаваная блан-дзінка. — Адкуль у цябе такая апранашка?

— Я купіла яе ў Варшаве, — зманіла Зося.

Хлопцы таксама былі пад уражаннем адной мадэлі адзення. Паўл Пятрушэня надзеў зялёны фрак. Зося падумала, што ён таксама набыў яго ў секенд-хендзе...

Перад поўначчу ліцэісты пайшлі на горад пазахапляцца феерверкамі. Сярод вясёлага натоўпу яны сустрэлі свайго настаўніка гісторыі. Спадар Іванюк выйшаў на шпацыр са сваім катом. Ён крыху збянтэжыўся, калі пабачыў сваіх вучняў. І чамусьці адразу схаваў свайго ката пад кажух. Ліцэісты, вядома, сталі па чарзе віншаваць настаўніка і яго ката з Новым годам.

Пасля не было іншай размовы. Вучні гадалі па чарзе чаму аматар старажытнай Асірыі шпацыраваў з катом персідскай пароды. З гісторыі вядома, што Асірыя ўпарта ваявала з Персіяй.

— Я ведаю чаму ён узяў беднага ката ў такі момант, — сказала Зося.

Як вядома, каты і сабакі вельмі баяцца навагодніх выстралаў і феерверкаў.

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн: majeszkorowu@tlen.pl

Музыка з кайфам

Музыка ў нарцінках

Дажылі мы такіх часоў, што зараз музыка амаль не ў змозе самастойна існаваць. У гаражах маладыя музыкі граюць усё ж такі нягледзячы на ўмовы рэчаіснасці, але я ўпэўнена, што большасць з іх марыць аб славе — папулярнасці, распазнавальнасці, прызнанні. Аднак сёння ніхто іх не пазнае, пакуль нейкі лейбл не выдасць іхні альбом, а калектыў людзей не папрацуе над рэалізацыяй іхняга кліпа. Кар'еру ў музыцы можна рабіць пры такіх умовах, што будзе падрыхтаваны кліп, дзякуючы якому будзе весціся прамоцыя, а свет будзе яго аглядаць кавалак па кавалку на тэлеканалах ды ў інтэрнэце.

Нічога тады дзіўнага, што ў ліку шматлікіх конкурсаў з'явіўся ўрэшце і конкурс на самыя лепшыя кліпы ў Беларусі. Але той, пра які кажу, адметны адной галоўнай рысай. Да ўдзелу ў гэтым аглядзе прымаюцца толькі кліпы знятыя на беларускамоўныя песні. Такім чынам у „Кліп-марафон-2008" не патрапілі хаця б знакамітыя кліпы беларускага, але не заўсёды беларускамоўнага гурту „Ляпіс Трубяцкой". Аднак магчыма было пабачыць шмат іншых, уключна з самымі першымі візуальнымі ілюстрацыямі беларускіх песень, пачынаючы яшчэ з васьмідзесятых гадоў. Не ведаю, ці хтосьці з вас ведае, што першы беларускі кліп быў знаты на песню гурту „Бонда" пад загалоўкам „Ура!". Многіх гледачоў неаднойчы ўражаў таксама кліп на песню „Я рок-музыкант" гурту „Мроя", у якім маладзенькі Лявон Вольскі з калегамі адыгрываюць ролю будаўнікоў і часам, гледзячы на гэты відэазапіс, адчуваю, што гэта мог бы быць таксама кліп на песню польскай вакалісткі Ізабэлі Траяноўскай пад аднаназначным загалоўкам „Падай цэглу". Што ж, такія часы. Зараз тэхніка дазваляе нашмат больш, таму паўстаюць выдатныя мульцікі, як той на песню „Тры янгалы" гурту „Тройца", які, дарэчы, перамог у сваёй катэгорыі. У „альтэрнатыўнай" катэгорыі ўзнагароду атрымаў кліп „Дажджамі" гурту :Б:Н:, а самы лепшы „пэрформанс" дастаўся гурту „Zig Zag" ды аўтару кліпа на кавер „Танкаў" гурту „Нейра Дзюбель". Калі так ужо падводжу вынікі вельмі важнага, як аказваецца конкурсу, дык варта сказаць пра пераможцу. Стаў ім кліп на песню „Падае дождж" гурту „Крама". Такім чынам Ігар Варашкевіч, лідар гуртоў „Крама" і „Бонда", стаў героем першага ў гісторыі ды апошняга, самага лепшага, беларускага кліпа.

Ігар Варашкевіч

i_basovka@o2.pl

Вершы Віктара Шведа

Чаму ў ільва вялікая галава?

— Скажы, матуля дарагая,
Чаму леў гэты наяву
На здзіў вялікі мае
Атромністую галаву?

— Таму вось, дарагі мой дзетка,
Такую галаву даў Бог,
Каб ён са сваёй моцнай клеткі
На вонкі вылезці не мог.

Абаронца прэсы

Настаўнік кажа: — Прыйдзе
пара гэта, Што тэлебачанне
нам выцісне газеты.
І інфармацыі мы ўсе аглянем
На тэлевізара бліскучым экране.

— Па-мойму гэта зусім немагчыма, —
Запярэчыў раптам вучань Дзіма.
— Мне непрыемна гэтае ўсё слухаць:
Як тэлевізарам забіць
на сцяне муху?

Польска-беларуская крыжаванка № 3

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 51:

Душ, цвет, кумір, мелодыя, пік, як, ікс, яда, на, перац, кароль. Індык, кепка, Уліс, пах, цмок, ер, від, ядро, перыяд, Аля, якасць.

Узнагароды, каляровыя алоўкі, выйгралі **Юстына Вакулюк** з Арэшкава, **Ева Галёнка** з Бельска-Падляшскага, **Малгажата Купрыянюк** з Беластока, **Агнешка Мароз** з Гайнаўкі. Віншуем!



ЗАГАДКА КЛЯНОВАЕ НЕПАЎТОРНАСЦІ

Павольна ішла Яна паркам, і сонца ціха спявала ў шэра-зялёных вачах.

Была восень, непаўторная восень. Ёй хацелася адпачыць, напіцца апошнім водарам знікаючага цяпла, проста растаць у гэтых алеях, дрэвах, купінах апалай, прыціхлай лістоты. І яшчэ адна думка цвяліла, настойлівым павуціннем лёгка казытала сэрца: магчыма, яна сустрэне... Аднак — не варта, не трэба так часта; і сумна-вясёлыя думкі адганяліся прэч, як адганяюцца іншым разам надакучлівыя птушаняты ад паркавай лавы, дзе залатая бабулька з маладым паглядам крышыць ім вечаровай выпечкі хлеб.

Але вечар, восеньскі вечар — толькі акрэсліўся, толькі набліжаўся. Таму так шчыра дыхалася ля ўлюбёнага клёна, так непасрэдна прасілася ў рукі абляцелае, адшамацелае лісце. Раптам кінуўся, зазірнуў Ёй у вочы з ахайна сабранай купіны ліст, зусім не падобны на іншых. Урэшце, усе яны былі не падобныя адзін на аднаго; але гэты маніў сваёй жоўта-зялёнай рознакаляровасцю, далоневай дакладна акрэсленай і адначасна ўнікальнай формай, прыцягальнасцю выразных, па-хуліганску шчыльна пераплеценых жылак.

— Які ж ты!.. — не заўважыла, як ціха прамовіла ўслых, нахіляючыся ды падымаючы сонечную сваю знаходку.

— Хіба на гэтым свеце можа быць яшчэ нехта, каму можна сказаць „Якая ж ты!..”? І гэтае стварэнне, гэты чалавек — ты, — пачулася раптам за спінаю. А яшчэ праз імгненне Яна свяцілася і гарэла, як гарэлі ўвесь гэты кастрычніцкі парк, уся бронзавая, п’янотная восень.

— Можа, — з пачуццём звыклае супярэчнасці адказала, паказваючы сваю спічастую кляновую знаходку. — Думаю, ты ніколі не зможаш знайсці абсалютна такі ж.

— А калі знайду, пацалаваць — дазволіш?

— Ну, па-першае, хіба на гэта трэба пытацца дазволу? А па-другое, у прыродзе нічога і ніколі не паўтараецца.

— Ты думаеш? — з лёгкай усмешкай, а хутчэй нават з вечаровым, загадкавым смехам Ён растаў у паркавых акварэлях, а праз нейкую хвілю — зноў стаяў побач, працягваючы дакладна такі ж кляновы лісток: колер у колер, кропка ў кропку, жылка ў жылку.

— Але як такое магчыма?! — не верыла сваім фантастычна прыгожым вачам. — Так не бывае.

— Як бачыш, бывае.

І быў той пацалунак — самым сапраўдным, восеньскім, хрызантэмным. Адзінае возера бачыла Іх; і плакала, бязгучна і прыгожа — ад шкадобы, што немагчыма захаваць няўлоўнае, ад радасці за тых, хто знаходзіць нарэшце так доўга шуканае, ад болю, што вецер і час замятае нават самыя дакладныя адбіткі на дарогах, пакрытых расплаўленым ліставеем.

Толькі на раніцу яны ўбачылі, калі выпадкова перавярнулі лісты на іншыя бакі, што былі яны, — абсалютна рознымі.

Ігар СІДАРУК
Кобрын

Да 20-годдзя рэгістрацыі

Мікола ВАЎРАНЮК

Сённяшняя Усходняя Беласточчына — гэта перыферыя беларускага этнічнага арэала. Тым не менш, у нацыянальнай беларускай гісторыі адыграла ролю значна больш істотную чымсьці вызначыла ёй геаграфія. Гэта выхадцы з Беласточчыны, маладыя прафесары Віленскага ўніверсітэта Міхал Баброўскі, Ігнат Даніловіч, Ігнат Анацэвіч, Язэп Ярашэвіч у першай палове XIX стагоддзя сфармавалі пастулат аўтаноміі Вялікага Княства Літоўскага з беларускай мовай як дзяржаўнай[1].

Наўрад ці хто з заснавальнікаў Беларускага аб’яднання студэнтаў у 1981 годзе чуў пра гэтыя асобы, як і іх духоўных спадкаемцаў: студзеньскага паўстанца і выдаўца „Мужыцкай праўды” Кастуся Калінноўскага (родам з Мастаўлян) ды нарадавольца і царазабойцу Ігната Грынявіцкага (родам з Вялікіх Грыневічаў). У захаваных дакументах няма спасылкі на гістарычную спадчыну. БАС радзіўся як водгук на бягучыя падзеі ў Польшчы, у польскіх вышэйшых школах. Быў гэта час рэвалюцыі „Салідарнасці”, забастовак, гарачых дыскусій, крытыкі пануючага грамадска-палітычнага парадку, пачуцця свабоды. Так пачаткі беларускага студэнцкага руху запамятаў Ян Максімюк: *Сапраўды цяжка назваць самую галоўную прычыну нашага гуртавання. Было пачуццё, што рыхтуецца абед, а нас не запрасілі да застолля. Мы адчулі сябе не чужынцамі, не аўтсайдарамі, а проста — іншымі людзьмі, у якіх свой самастойны погляд на „польскую рэвалюцыю”, погляд, які грунтуецца на нечым толькі нам супольным і вядомым, што неўпрыкмет стала для нас надзвычайнай каштоўнасцю. Была за гэтым поглядам нашая бацькоўская спадчына, наша мова, рэлігія ці мо нешта яшчэ іншае. Хутчэй за ўсё прага, якую паэт называе „людзьмі звацца”. Каб загаварыць уласным голасам, каб заманіфеставаць сябе. Трэба было падняць клапан і выпусціць затхлае паветра, назапашанае ў душы ў сямідзесятых гадах, гадах „нацыянальна аднароднай” Польшчы. Крый Божа, сынок, каб ты прызнаваўся, што ты беларус — словы такія напэўна пачуў ад сваіх клапатлівых бацькоў не адзін з маіх сяброў-студэнтаў тае пары*[2].

Ян Максімюк лічыць, што тэрмін „беларускі студэнт” набыў канкрэтны сэнс пасля сходу студэнтаў варшаўскага асяроддзя 30 мая 1981 года ў клубе Беларускага грамадска-культурнага таварыства па вул. Сенатарскай, 8: *Сход афіцыйна прыняў рашэнне аб пакліканні ў Польшчы Беларускага аб’яднання студэнтаў, зацвердзіў ягоны статут і выбраў прадстаўнікоў, якім даручалася права на ўступленне ў перагаворы з Міністэрствам навукі з мэтаю рэгістрацыі аб’яднання. Усе члены сходу лічыліся заснавальнікамі БАС*[3]. Заснавальнікаў аказалася 45 чалавек, а прадстаўнікамі для кантактаў з уладамі былі выбраны Ян Гаворка, Ян Максімюк, Яўген Рыжык і Сцяпан Базылюк[4].

Фота Лёніка Тарасэвіча

Ян Максімюк

Беларускае аб’яднанне студэнтаў галоўнай мэтай дзейнасці лічыла развіццё грамадскай, культурнай і навуковай актыўнасці беларускай студэнцкай моладзі. А таксама прапагандаванне талерантнасці і добрых стасункаў беларускай грамадскасці з польскай ды іншымі, якія пражываюць у Польшчы[5]. Арганізацыя не была зарэгістраваная. Міністэрства навукі, вышэйшага школьніцтва і тэхнікі 29 ліпеня 1981 года адказала: *przedstawione w statucie cele i zadania organizacji w znacznej części stanowią powtórzenie celów i zadań statutowych już istniejących organizacji studenckich o zasięgu ogólnopolskim; część zadań statutowych, w szczególności dotyczących propagowania kultury białoruskiej oraz zaspokajania potrzeb członków organizacji w tym zakresie — nie wiąże się z problematyką szkoły wyższej, a realizacja tych zadań jest możliwa w ramach istniejących w Polsce odpowiednich towarzystw społeczno-kulturalnych*[6]. Такі сам адказ на падобныя захады атрымалі студэнты літоўскай і ўкраінскай нацыянальнасцей.

Дазволіў я сабе працытаваць адказ улад, бо прыведзеныя ў ім аргументы добра адлюстроўваюць сітуацыю нацыянальных меншасцей у Польскай Народнай Рэспубліцы. Кожная нацыянальнасць з 1956 года мела адну афіцыйную арганізацыю і адзін прэсавы орган (беларусы: Беларускае грамадска-культурнае таварыства і „Ніву”) пад апекай Міністэрства ўнутраных спраў. Адзінай галіной нацыянальнай культуры, у якой мешасці маглі сябе праяўляць, быў фальклор. У найлепшым выпадку меншасці маглі працягваць вегетацыю, але не развівацца. У выніку паскорыўся працэс паланізацыі. Яго апагей выпаў на сямідзесятыя гады, калі пры ўладзе Эдварда Герэка „Польшча расла ў сілу, а людзі багацелі”. 20 лютага 1976 года на трэцім пленуме ЦК Польскай аб’яднанай рабочай партыі Польшча была аб’яўлена нацыянальна аднароднай краінай[7]. Пра тагачасную цяжкую атмасферу піша Ян Максімюк у вышэйпрыведзенай цытаце. Таму студэнцкая ініцыятыва была як неспадзяваны глыток чыстага паветра. Магчыма гэта было дзякуючы тагачасным палітычным падзеям у Польшчы.

Карнавал свабоды 13 снежня 1981 года спыніла ваеннае становішча. Да таго часу Беларускае аб’яднанне студэнтаў, якое дзейнічала неафіцыйна, паспела пакінуць свой след. Выдала два нумары інфармацыйнага бюлетэня „Апошнія паведамленні” (трэці, падрыхтаваны, быў канфіскаваны ў друкарні пасля 13 снежня). Восенню 1981 года сарганізавала вандроўку па Кнышынскай пушчы і атрасіны студэнтаў-першакурснікаў у Варшаве (гэтыя формы дзейнасці будуць найбольш характэрнымі студэнцкаму руху на працягу ўсяго апісванага мною дзесяцігоддзя). І бадай галоўнае, 24 кастрычніка 1981 года ў Беластоку прайшоў з’езд студэнтаў з беластоцкага, варшаўскага і люблінскага асяроддзяў. Прысутнічала на ім каля 200 асоб[8]. Гэта была ўжо маса здольная генераваць лідараў, якія пры першай нагодзе зноў вернуцца да ідэі сваёй студэнцкай арганізацыі. Бо, як я ўжо пісаў, БАС паўтара месяца пасля з’езда будзе задушаны ваенным становішчам.

Другая „Бацькаўшчына” перад царквой у Гарадку, 1985 г.

Такая нагода паявілася год пазней, калі ўлады ў рамках „нармалізацыі” сітуацыі ў вышэйшых школах сталі арганізаваць Згуртаванне польскіх студэнтаў (Zrzeszenie Studentów Polskich). 20 лістапада 1982 года Ініцыятыўная група студэнтаў нацыянальных меншасцей грамадзян ПНР звярнулася з адозвай да Устаноўчага кангрэса ЗПС стварыць у рамках гэтай арганізацыі Краёвую раду культуры студэнтаў нацыянальных меншасцей. У адозве апісваюцца безвыніковыя старанні зас-

Беларускага аб'яднання студэнтаў

наваць асобныя арганізацыі студэнтамі беларускай, літоўскай і ўкраінскай нацыянальнасцей у папярэднім годзе. Асяроддзе, якое складаюць студэнты гэтых нацыянальнасцей, ацэньваецца на пяць тысяч. Але найбольш стан ведаў пра нацыянальныя меншасці ў Польшчы, адносіны да іх большасці ды псіхалагічны камфорт меншасных грамадскасцей адлюстроўвае пачатак адозвы: *Koleżanki i Koledzy! Mamy nadzieję, że nie przestraszą Was użyte tu przymiotniki, a mianowicie: białoruski, litewski, ukraiński, czy też inne. Białorusin, Litwin, a zwłaszcza Ukrainiec jako obywatel tego państwa, w okresie powojennym, rzadko kiedy był synonimem dobra, postacią ocenianą pozytywnie* [9].

Рэйд з цыклу „Падарожжа" завітаў у Крынкі да Сакрата Яновіча

Адозва была відаць загадзя ўзгоднена з уладамі новай студэнцкай арганізацыі, бо ўжо наступнага дня апублікавала яе „Gazeta Zjazdowa", а 15 снежня быў гатовы праект прэсавага органа Краёвай рады культуры студэнтаў нацыянальных меншасцей — аддзела Згуртавання польскіх студэнтаў. Часопіс павінен выходзіць на польскай, беларускай, літоўскай і ўкраінскай мовах. Беларускі загаловак: „Сустрэчы"[10]. Першага польска-беларускага нумара бюлетэня з польскім загалоўкам „Spotkania" давялося чакаць больш года. Выйшаў друкам у пачатках 1984 года, хоць датаваны папярэднім годам[11]. А Рада культуры была зарэгістраваная 16 мая 1983 года[12]. Патрэбу гуртавання беларускіх студэнтаў выклаў у другім па чарзе нумары „Сустрэч" галоўны рэдактар бюлетэня Ян Максімюк: *Сваёй агульнаграмадскай актыўнасцю накіраванай ці то на стварэнне ўмоў для належнага развіцця новай беларускай культуры, ці то на захаванне існучай спадчыны студэнты не толькі прадаўжаюць існаванне свайго народа, але — і гэта цяпер самае галоўнае — як яго лепшы, адукаваны слой, у працы ствараюць гурт душэўна незнявечаных беларусаў, якія на справу сваёй нацыянальнай прыналежнасці не глядзяць як на грэх ці божую кару. (...) Змагары-студэнты! Праявіце незвычайную сілу, каб стаць звычайнымі людзьмі! Каб дыхаць чыстым паветрам!*[13]

Студэнты-беларусы нармальна, як і іх польскія сябры, вучыліся і здавалі іспыты. Апрача гэтага вывучалі родную гісторыю, геаграфію сваёй малой айчыны — Усходняй Беласточчыны. Арганізавалі вандроўкі, якія назвалі па-вайсковаму рэйдамі. Найбольшы рэйд, — прыдуманы Лёнікам Тарасэвічам, — „Бацькаўшчына" праходзіў штогод у ліпені, меншыя „Падарожжа" — вясной і восенню. Цікавыя былі два рэйды „Развітанне" — у 1986 і 1987 гадах — па тэрыторыі, якая сёння пад люстрам вады Семяноўскага вадасховішча. Імпрэзы забаўляльнага характару, такія як запусты, сустрэчы Новага года, а перш-наперш атрасіны першакурснікаў прыцягвалі тлум народу. У Беластоку ўдзельнічала ў іх і па паўтысячы чалавек. Кожная забава мела нейкі элемент адукацыі, патрыятычнага выхавання. У час атрасін, напрыклад, прысяга беларускага студэнта, на рэйдах — гістарычныя даклады, на Купаллі — вывучэнне этнаграфіі. Дарэчы, студэнты адрадзілі адзначванне гэтага паганскага свята на Беласточчыне.

Студэнцкія „Атрасіны" ў беластоцкім клубе „Гвінт"

Апрача „Сустрэч" студэнты са студзеня 1986 года раз у месяц рэдагавалі старонку ў „Ніве" пад загалоўкам „Прысутнасць". Тут рабілі свае першыя крокі ў журналістыцы сённяшнія рэдактары „Нівы", радыё ды тэлебачання. Арганізавалі ў Беластоку цыкл дакладаў па беларускай мове, літаратуры і гісторыі, названы Беларускім народным універсітэтам. Адрадзілі традыцыю святкавання 25 Сакавіка. Упершыню Дзень Волі адзначылі ў канспірацыі ў варшаўскім клубе БГКТ у 1985 годзе, а першы раз адкрыта — у 1989 годзе ў інтэрнаце Медыцынскай акадэміі па вуліцы Акадэміцкай у Беластоку[14]. Рабілі намаганні ўвесці беларускую мову ў праваслаўныя багаслужбы[15]. Безвынікова.

Тым часам ваеннае становішча адыходзіла ў нябыт, дыхаць станавілася лягчэй. У днях 28-29 сакавіка 1987 года ў Бельскім доме культуры прайшоў З'езд беларускіх студэнтаў. Спісак прысутных змяшчае 163 асобы[16]. Удзельнікі з'езда прыйшлі да высновы, што беларускім студэнтам зацесна ў Згуртаванні польскіх студэнтаў. Зрэшты, многія лідары беларускага студэнцкага руху ніколі не запісаліся ў ЗПС па прычыне яго ідэалагічнага характару. Пётр Багроўскі падчас з'езда, фармальна арганізаванага Радай культуры пры ЗПС, (...) *запрапанаваў стварыць самастойную студэнцкую арганізацыю і назваць яе Беларускае аб'яднанне студэнтаў. Прысутныя прынялі прапанову гучнымі воплескамі*[17]. Гэты крок да самастойнасці быў рашуча асуджаны Агульнапольскай радай культуры студэнтаў нацыянальных меншасцей ЗПС[18]. Справа адтэрмінавалася на год.

Устаноўчы камітэт новага Беларускага аб'яднання студэнтаў завязаўся падчас святкавання Дня Волі ў Беластоку 26 сакавіка 1988 года і заявіў, што ставіць сабе за мэту рэгістрацыю арганізацыі і легальную дзейнасць у рамках законаў Польскай Народнай Рэспублікі[19]. Да рэгістрацыі БАСу дарога, аднак, была няпростая. Першае рашэнне ўлад было адмоўнае. Толькі пасля абскарджання рашэння дырэктар Грамадска-адміністрацыйнага аддзялення Управы сталічнага горада Варшавы Ян Гардэюк даў згоду на дзейнасць арганізацыі. Было гэта 29 лістапада 1988 года[20]. А ўжо 17 снежня прайшоў сход БАСу, які выбраў улады арганізацыі. Першым легальным старшынёй Беларускага аб'яднання студэнтаў у Польшчы стаў Яўген Вапа, студэнт гісторыі Варшаўскага ўніверсітэта[21].

Наступныя гады прынясуць многа змен, перш-наперш палітычных. Перастане існаваць Польская Народная Рэспубліка, а яе месца зойме III Рэч Паспалітая. У ёй ужо свабодна змогуць дзейнічаць палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі, у тым ліку і нацыянальных мяншынь. Беларуская грамадскасць Беласточчыны таксама актыўна ўключыцца ў гэтую радасную творчасць і створыць некалькі дзесяткаў розных структур, сталых і зусім эфемерыдных. Але то Беларускае аб'яднанне студэнтаў, якое стварала хоць і пакутліва, але дзякуючы выключна грамадскай ініцыятыве, насуперак дзяржаўнаму камуністычнаму апарату і сваім апартуністам пратаптала першы след. Паказала, што дзякуючы настойлівасці і ўпэўненасці ў свае сілы і сваю рацыю можна дабіцца станоўчых рэзультатаў.

Беларускае аб'яднанне студэнтаў у 1989 і пазнейшых гадах таксама не ўцячэ ад палітыкі. Дзеячы арганізацыі будуць і рабочай сілай, і мазгамі чарговых беларускіх выбарчых камітэтаў. Але я ў якасці найбольшага дасягнення БАСу назваў бы Фестываль музыкі Маладой Беларусі „Басовішча", без якога не ўяўляюць сабе лета на Беласточчыне тысячы маладых беларусаў і палякаў. Першае „Басовішча" прайшло ў Гарадку ў 1990 годзе і з таго часу арганізуецца ў гэтым самым месцы штогоду. Дзякуючы фестывалю, беларуская культура перастала атаясамлівацца адно з вышыванымі кашулямі ды лапцямі. А маладыя беларусы Беласточчыны перасталі глядзець на сваю нацыянальнасць як на нейкі горб. І маглі ўрэшце дыхнуць чыстым паветрам. Прынамсі некаторыя.

Пакаленне, якое актыўна ўдзельнічала ў студэнцкім руху ў 80-я гады мінулага стагоддзя і пазней не склала ідэі беларускасці на алтары прафесійнай кар'еры ці сямейнага дабрабыту. Стараецца, каб будучыня беларускай нацыянальнай меншасці на Падляшшы не залежала толькі ад грамадскай ініцыятывы чарговых пакаленняў, але была забяспечана адпаведнымі інстытутамі. Таму колішнія басаўцы змагаліся за беларускія аддзелы ў дзіцячым садку ці навучанне беларускай мовы ў беластоцкай школе. Таму як мантру паўтараюць лозунг заснавання — са штатамі фінансаванымі польскай дзяржавай — Інстытута беларускай культуры ў Беластоку. Але гэта ўжо іншая гісторыя.

[1] Eugeniusz Wappa, *Białostocczyzna i narodziny białoruskiego ruchu studenckiego*, [w:] *Białoruski ruch studencki w Polsce 1981-92, wybór dokumentów*, Białystok 1995, s. 12.
[2] Ян Максімюк, *Успамін*, „Сустрэчы" н-р 2 (7), Варшава 1987.
[3] Там жа.
[4] *Białoruski ruch studencki...*, s. 33.
[5] *Statut Białorskiego Zrzeszenia Studentów w Polsce*, [w:] *Białoruski ruch studencki...*, s. 35.
[6] Там жа, с. 42.
[7] Eugeniusz Wappa, op. cit., s. 16.
[8] Ян Максімюк, *Успамін*, ч. 2, „Сустрэчы" н-р 1-2 (8-9), Варшава 1988.
[9] *Białoruski ruch studencki...*, s. 61.
[10] Там жа, с. 62-63.
[11] Сакрат Яновіч, *Вітаем „Сустрэчы"*, „Ніва", 8.04.1984.
[12] „Spotkania". Pismo Studentów Mniejszości Narodowych, Jednodniówka nr 1, Warszawa 1983.
[13] Ян Максімюк, *Дыхаць чыстым паветрам*, „Сустрэчы" н-р 1, Варшава 1984.
[14] Вусныя ўспаміны тагачасных студэнцкіх дзеячаў: Яўгена Вапы, Юркі Ляшчынскага і аўтара.
[15] *Białoruski ruch studencki...*, s. 83, 84, 133.
[16] *Białoruski ruch studencki...*, s. 120-124.
[17] *І З'езд беларускіх студэнтаў. Стэнаграма ў скарачэнні*, „Ніва", 19.04.1987.
[18] *Białoruski ruch studencki...*, s. 128-130.
[19] Там жа, с. 147-148.
[20] Там жа, с. 162-164, 170.
[21] Там жа, с. 171.

Гартаючы „Год беларускі-2009”

Напярэдадні Каляд Сакрат Яновіч даслаў з Крынак з Villi Sokratesa чарговае (дзесятае па ліку) выданне „Annus Albaruthenicus-2009”. Том салідны, таму чытаць яго хапіла на ўсе калядныя святы.

Адкрываецца штогоднік артыкулам-эсэ Юры Вашкевіча „Sowjetische Kultur in Belarus”. У ім аўтар разглядае пытанні ўплыву камуністычнай улады і ідэалогіі на культуру Беларусі, цікава аналізуе асаблівасці савецкай цэнзуры, якая нанесла нямала шкоды беларускай культуры наогул, і якая падаўляла індывідуальнасць і свабоднае выяўленне мастацкіх задумак творцаў. У нечым з аўтарам можна пагадзіцца, а ў нечым паспрачацца. Але падобны артыкул павінен быць напісаны і ён чытаецца.

Працягам тэмы можна назваць і матэрыял Рышарда Радзіка, які апублікаваны пад назовам „Is Belarus Part of Europe?”. Калі пры савецкай уладзе на культуру Беларусі вялікі ўплыў рабіла савецкая ідэалогія, то цяпер паўстае пытанне: ці з'яўляецца Беларусь часткай Еўропы? Аўтар сцвярджае, што прапорцыя рэспандэнтаў, якія лічаць сённяшнюю Беларусь часткай Еўропы, значна перавышае прапорцыю прыхільнікаў „еўрапейскага выбару” ў беларускім грамадстве, калі браць пад увагу сацыялагічныя апытанні.

Аляксандр Тарановіч у сваім артыкуле спрабуе разгледзець праблемы эміграцыі. Ён адказвае на шэраг пытанняў: што падштурхоўвае чалавека на эміграцыю? Што такое эміграцыя? Ці кожны чалавек здольны быць эмігрантам? Ці існуюць пэўныя формы і законы эміграцыі? І г.д. І ўсё ж эміграцыі без настальгіі не бывае. Таму аўтар спрабуе разабрацца і з настальгіяй па Радзіме. Вядома, Радзіма можа абысціся і без нас, а вось ці мы абыдземся без яе.

Пра Гацькі — антычнае гарадзішча недалёка ад Бельска, разважае ў штогодніку Януш Корбель. У гістарычных слаях гэтага гарадзішча знаходзяцца сляды ранняй каланізацыі ўсходу Еўропы — кельтаў, старагерманаў, балтаў, славян. Адсюль, як лічаць даследчыкі, пачалася ўсходнеславянская цывілізацыя. Аўтар засяроджваецца на новых даследаваннях Гацькоў. А Міхал Врублеўскі спрабуе разгледзець пытанне, звязанае з граніцамі былога Вялікага Княства Літоўскага.

На падставе гісторыі Крынак і гістарычных крыніц пра мястэчкі Беларусі, Віталь Карнялюк паспрабаваў у сваім артыкуле звярнуць увагу на шматнацыянальнасць і шматканфесійнасць беларускіх мястэчак.

Вялікі артыкул Арнольда Макміліна прысвечаны паэзіі Рыгора Барадуліна. А Алена Таболіч на англійскую мову пераклала ўрыўкі з аўтабіяграфіі і вершы Ларысы Геніюш. І наадварот, англійскі паэт Філіп Ларкін загучаў пабеларуску ў перакладзе Зміцера Занеўскага. Паэзія Ларкіна нялёгкая. Яе паэт прысвячае пачуццёва-філасофскаму асэнсаванню „бегу часу”. Адсюль яго галоўныя матывы: памяць пра мінулае, адзіноцтва і смерць. Філасофія творчасці Філіпа Ларкіна абгрунтавана ў метафарах, якія падкрэсліваюць трагічны план існавання чалавека:

Калі б мне сказалі
Прыдумаць рэлігію,
Я б скарыстаў ваду...

Зміцер Занеўскі пераклаў на беларускую мову і вершы англійскага паэта Руперта Брука (1887-1915). Паэзія Брука вызначаецца шчырасцю маладосці, свежым успрыманнем рэчаіснасці, тонкай лірыкай і нават жартаўлівасцю. Найбольш вядомыя яго санеты. Усё гэта разам з прывабнай знешнасцю і заўчаснай смерцю паэта зрабіла яго папулярным у свой час сярод моладзі:

Спакой такі! Значыць, мне трэба
Забыцца, што няўдалы я каханак.
Смяюся. Не, паміраць не трэба.
Радуйся! О сосны! Аж да неба!..

Дарэчы, пры жыцці Руперт Брук напісаў п'есу „Літва”, якая была нават пастаўлена на сцэне аднаго з тэатраў Чыкага.

Празаічныя творы Лаема О'Флэгерты, Уільяма Батлера Ейтса, Сэмюэла Бэкета на беларускую мову пераклалі Андрэй Таболіч, Алесь Квіткевіч, Віталь Воранаў. Змешчаны па-польску і творы самога Віталя Воранава.

Цікавая падборка вершаў Юркі Баены толькі парадуе чытачоў. Творчасць паэта пакуль належным чынам не ацэнена не толькі ў Польшчы, але і ў Беларусі. А Юрка Баена — вельмі моцны паэт, паэт-філосаф, паэт-лірык, паэт, як пісала Ала Петрушкевіч, роднасці і адчужэння. Магчыма, на сённяшні дзень ён з'яўляецца ці не самым яркім паэтам Беласточчыны. Такія радкі, сапраўды, вартыя ўвагі:

***
Мары ўваскрэснуць,
Калі зацвіце край!
***
Летуценіць душа.
***
Зноў у сабе.
На сваім, святым я месцы.
***
Няма нічога так ціхага,
Як снег.
***
Ідучы ад слова да слова,
Увайшоў я ў лес
Слоў.
***
Час мой —
Між першым
І апошнім крыкам.

На апошніх старонках новага выдання змешчаны артыкул Анатоля Трафімчыка „Віктар Гардзей. Паэт і грамадзянін”. Віктар Гардзей родам з Берасцейшчыны, жыве ў Мінску. Друкуецца не так часта, але паэзія яго вартая станоўчай крытыкі, найперш тыя паэтычныя радкі, у якіх адчуваюцца ноткі грамадзянскай і пейзажна-філасафічнай лірыкі. Аб гэтым і разважае крытык Анатоль Трафімчык.

Сяргей ЧЫГРЫН

English | Deutsch | Español

"Беларусь.Belarus", #11(090), Październik, 2008

Ужо на працягу амаль года беларускія ўлады імкнуцца праявіць сябе пажадана з лепшага боку ў вачах замежнай, большай часткай еўрапейскай супольнасці. Тое-сёе ім удаецца — нездарма пасля апошніх выбараў у беларускі парламент Еўрасаюз зняў абмежаванні на ўезд для большасці чыноўнікаў, якія раней лічыліся датычнымі да пераследу апазіцыі. Добра паступіў Еўрасаюз ці дрэнна пакажа далейшае развіццё падзей, але пакуль афіцыйны Мінск аж са скуры выскоквае, каб данесці да Еўропы расповеды як добра жывецца беларускаму люду і як усё дзеля яго робіцца. Праўда, бачачы такі імпэт, узнікае нейкі сумнеў — надта ўжо ўсё прыгожа, як у тым часопісе, які называецца „Беларусь”.

Часопіс, як і яго віртуальная версія, належыць да бадай самых галоўных у Беларусі праўрадавых выданняў — „Советской Белоруссии”. Менавіта так па-руску і з камуністычным ухілам завецца гэтая газета. Што ж тычыцца часопіса „Беларусь”, то тут пра „савецкае” не ходзіць, бо з такім словам цяжка не толькі замежныя інвестыцыі прыцягваць, але і ўвогуле распавядаць пра свае „дасягненні” адносна свабоды, дэмакратыі і правоў чалавека.

Віртуальная версія часопіса „Беларусь” месціцца ў інтэрнэце па адрасе http://belarus-magazine.by. Беларускамоўнай старонкі на даным сайце няма. Затое ёсць чатыры іншыя — англійская, нямецкая, іспанская і польская. Каб перайсці на польскую, трэба з галоўнай старонкі адразу клікнуць на адпаведны надпіс унізе выяўлення. Тады перад нашымі вачыма адкрыецца даволі цікавы, хоць і аднаслепы ў афармленні сайт. Уверсе — назва часопіса лацінкай, бусел і нешта кшталту дэвіза: „Czasopismo dla Ciebie”.

Калі прачытаць артыкул, які называецца „Ад рэдактара”, то схіляешся да высновы, што даны часопіс не „для цябе”, а для дзяржавы, якая яго выдае. Нічога дрэннага ў тым, што гэтая дзяржава — Беларусь — няма, прыкра толькі, што далёка не аб усіх баках беларускага жыцця распавядаецца ў часопісе. А праўда, як гаворыцца, заўсёды ўсё перамагае, таму лепей аб ёй адразу і казаць. Але ў названым артыкуле ўсё вельмі прыгожа і нават не выклікае думкі аб нейкай самаізаляцыі Беларусі. „Białoruś potwierdza nastawienie polityki zagranicznej na różne kierunki. Interesy narodowe sięgają daleko na Zachód, nasze państwo chce budować stosunki z USA. Na uwagę zasługuje też nowy etap kontaktów z Unią Europejską. Dobre stosunki z Rosją. Dalej na Wschód — zbliżenie z Chinami. Polityka zagraniczna zakłada różnorodność i duży zasięg”, — запэўнівае рэдактар Віктар Харкоў, заклікаючы ў сваім артыкуле, нягледзячы на крызіс, укладваць грошы ў беларускую эканоміку. Ён таксама прыводзіць словы неназваных міжнародных экспертаў, якія расхвальваюць вялікую ролю дзяржавы ў кіраванні эканомікай, як гэта ёсць у Беларусі.

Будова сайта звычайная, праўда, тут усяго дзве часткі, але яны дастаткова поўна насычаныя інфармацыяй, якая тычыцца не толькі грамадска-палітычнай і эканамічнай тэматыкі, але і навукі, культуры, спорту і нават гісторыі. Маецца таксама архіў, які вядзецца ад 2006 года.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Доўгая дарога

Доўгая дарога чакае мужчынскія валейбольныя дружыны з нізкім рэйтынгам, якія мараць заваяваць права гуляць на чэмпіянаце свету, які пройдзе ў наступным годзе ў Італіі. Наўрад ці тую трохпрыступкавую формулу выяўлення шчаслівых уладальнікаў запаветных пуцёвак можна лічыць удалай. Але рэгламент ёсць рэгламент і застаецца толькі спадзявацца, што тры раўнды на выжыванне будуць заменены больш звыклымі адборавымі групамі, дзе лакальную няўдачу можна выправіць.

У ліку патэнцыйных марафонцаў і валейбалісты зборнай Беларусі, якія на мінулым тыдні прайшлі першы этап адбору. У горадзе Шэфілд на туманным Альбіёне выхаванцаў галоўнага трэнера Аляксандра Сінгаеўскага чакала выпрабаванне камандамі Ізраіля і Вялікабрытаніі. Цікава, што аб'яднаная зборная Вялікабрытаніі створана зусім нядаўна з розных суб'ектаў каралеўства і ў ёй гуляе шэраг шатландцаў, а таксама натуралізаваныя канадзец і бразілец. Да ўсяго гэтая зборная пад сцягам аднаго з клубаў гуляе ў нацыянальным першынстве Нідэрландаў.

У стартавым матчы міні-турніру прадстаўнікі Зямлі Абяцанай узялі верх над гаспадарамі пляцоўкі — 3:1. Так што, праўдападобна, для беларусаў амаль вызначальным станавіўся першы паядынак супраць Ізраіля. Двойчы цягам гэтай напружанай гульні нашы саступалі па сетах, але ў апошняй пятай партыі ўсё ж вырвалі перамогу. Агульны лік сустрэчы — 3:2 (24:26, 25:19, 18:25, 25:22, 15:11) на карысць беларусаў. Але гэта было яшчэ не ўсё. Брытанцы, якія лічыліся аўтсайдарамі сярод трыо спаборнікаў, перад сваімі гледачамі здолелі навязаць камандзе Беларусі сапраўднае змаганне. Так што гуляць давялося напоўніцу. У выніку была зафіксавана перавага падначаленых Сінгаеўскага — 3:1 (25:23, 13:25, 25:22, 25:17). Беларусь крочыць па дыстанцыі далей.

Што датычыць персаналій, то найлепшым чынам паказаў сябе капітан нацыянальнай дружыны Алег Ахрэм, які выступае за моцны грэчаскі „Іракліс”. Менавіта наш легіянер прынёс у гэтых сустрэчах найбольш ачкоў. Добра выглядалі на пляцоўцы Дзмітрый Жэгздрын, Сяргей Акуліч, Аляксандр Елістратаў. А ў цэлым зборная ў параўнанні з мінулым адборавым цыклам узмацнілася за кошт дасведчаных гульцоў. Акрамя Ахрэма ў абойме прадстаўнікі чатырох клубаў з нацыянальнага чэмпіянату — жлобінскага „Металурга”, брэсцкага „Заходняга Буга”, мінскага „Будаўніка” і магілёўскага „Металурга-БеЛа”. Склад патэнцыйна могуць дапоўніць яшчэ два легіянеры — блакавальнік Эдуард Венскі з фінскага „ВаЛеПа” і дайгроўшчык Аляксандр Каваленка з французскага „Аячча”.

Што наперадзе? Беларусаў у другім раўндзе чакаюць куды мацнейшыя каманды Нямеччыны (удзельніца апошняй алімпіяды), Славаччыны (якая летась выйграла Еўралігу) і Харватыі. Турнір пройдзе ў траўні на славацкай зямлі. Дзве лепшыя каманды з групы выйдуць у трэці этап спаборніцтваў. Той, хто зойме на пляцоўцы Славаччыны першае месца, трапіць у трэцім раўндзе ў квартэт з Польшчай, Францыяй і яшчэ адным пакуль невядомым удзельнікам. Той, хто зойме другое — у турнір з Расіяй і дзвюма зборнымі „ікс”. Чаму б не памарыць пра зялёнае святло ў канцы доўгай дарогі?

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Хацелася да бацькоў, дадому

Тэкст і фота Віктара БУРЫ

Нядаўна наведаў я вёску Тайніца-Гурная Міхалоўскай гміны. У гэтай вёсцы сустрэўся я з Аляксандрам Бурам, які расказаў мне пра сваё жыццё.

— Нарадзіўся я 3 сакавіка 1925 года ў Тайніцы-Гурнай. Мае бацькі Андрэй і Надзея былі земляробамі, мелі 7 гектараў зямлі, у тым ліку 5 га ворнага поля, а рэшта — гэта лес, паша і сенажаць. Трымалі каня, 2 каровы, авечак, свінней, курэй. Перад вайной жылося цяжка і бацьку трэба было хадзіць на заробкі да іншых гаспадароў, а зімою плесці каробкі і кошыкі на продаж. Працаваў таксама ў лесе каля Луплянкі і Бахуроў, ставіў метры і загатаўляў балансавую драўніну (папяроўку).

Калі прыйшлі саветы, маім бацькам таксама жылося цяжка. Палічылі нас кулакамі, застаўлялі ўступаць у калгас. Але неяк у нашай вёсцы калгас не атрымаўся. Цяжка, а да таго страшна і небяспечна стала жыць і пры немцах. Тады солтысам нашай вёскі быў Аляксандр Казакевіч. Пачаліся вывазкі моладзі на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Нямецкія ўлады загадалі абавязкова здаваць мяса, малако, збожжа. Суровае пакаранне пагражала тым, хто трымаў парася на свае патрэбы. Увялі таксама г.зв. начныя варты. Трэба было ўначы па чарзе хадзіць па вёсцы, сачыць ці ў вёсцы няма партызан. Помню, як у нашу вёску ноччу прыходзілі партызаны за харчамі. Сяляне давалі ім хлеб, сала, сушылі ім мокрую вопратку. Сувязным партызанскага атрада быў Міхал Лаўрэш. Партызаны дзейнічалі на чыгунцы Цісоўка — Нараўка. Мелі яны дзве зямлянкі — адну ва ўрочышчы „Лясным", другую — каля рыбацкага ўрочышча „Гарабінка".

Калі мне было 17 гадоў, солтыс назначыў мяне і аднагодкаў Івана Кузьміцкага і Веру Назарка на высылку на прымусовыя работы ў Нямеччыну. У вызначаны дзень трэба было явіцца ў Міхалова. Я ўсведамляў, што такое чужыя зямля і людзі ды прымусовая работа. Прыйшоў той дзень і бацька з маці падрыхтавалі мне мяшочак з хлебам, сухарамі і салам. Закінуў я мяшочак за плечы і пайшоў з бацькам 13 км у Міхалова. Дома засталіся маці з малодшым братам Міхалам. Ідзём мы з татам, а ногі не ідуцца, як бы не свае. А бацька ўсё мяне павучае, асцерагае, раіць як паводзіць сябе ў нямецкага баўэра. Падыходзім пад Юшкаў Груд, аглядаемся, а за намі ідзе мама з цёткай Любай — так адпраўляла мяне родная маці, якая не магла расстацца з сынам. Быў гэта сакавік 1943 года.

Дабраліся мы да Міхалова на зборны пункт. Прымусовых рабочых сабралася многа. Чакалі нас вялікія самаходы, абабітыя дошкамі. Жандары заганялі нас у машыны, дапамагаючы сабе дубінкамі і нагайкамі. Завезлі нас на станцыю Валілы, пагрузілі ў вагоны і ў нялюдскіх умовах павезлі ў Прусію. У Кёнігсбергу выпусцілі нас з вагонаў, загналі на пляц і выстраілі ў шарэнгу. Да нас падыходзілі „купцы", якія выбіралі сабе парабкаў. Мяне выбрала маладая жанчына з мястэчка Аленбург, крайс Вегляў (цяпер пасёлак Дружба каля Знаменска ў Калінінградскай вобласці).

Баўэр называўся Ота Мольдынке, а ягоная дачка — Гунгільда, якой было 18 гадоў. Яе бацькі былі прыстарэлыя і яна ў асноўным кіравала гаспадаркай. У баўэра быў яшчэ і сын Адольф на французкім фронце, але дадому прыязджаў зрэдку. Ставіўся ён да мяне добра і ў час адной пабыўкі зрабіў мне здымак. У гаспадарцы было трое коней, 10 кароў, статак свіней. Жыў я на вышках у аборы. Былі яны прыстасаваныя для жылля, бо там жыў сам гаспадар, калі ў яго згарэла хата. Зімой было цёпла. Кармілі мяне асобна на кухні, харчавалі тым, што і самі елі. У поле таксама бралі добры абед. Працавалі ад цямна да цямна. Мой гаспадар адразу заўважыў, што я ўмею абыходзіцца з коньмі, каровамі, што мне работа на гаспадарцы не чужая.

Брычкай разам з баўэравай дачкой ездзілі мы на пашу даіць кароў або ў мястэчка па нейкіх справах. Я добра даглядаў коней і лейцы былі ў маіх руках. З кожным днём я штораз больш разумеў панямецку.

Па-суседску быў маёнтак Прымар. Я туды часта хадзіў наведваць такіх самых парабкаў як і я. Усе мы чакалі канца вайны, хацелася да бацькоў, дадому. Калі стаў набліжацца фронт, гаспадары сталі рыхтавацца ўцякаць. Мой баўэр запрог трое коней у вялізныя калёсы з драбінамі, пагрузіў неабходныя рэчы, узяў сям'ю і мяне і паехалі мы на захад. Ехалі каля двух тыдняў, спыніліся каля земерзлага возера. Быў люты 1945 года. На возеры сабралася многа ўцекачоў. Надляцелі рускія самалёты і сталі бамбіць. Многія бежанцы апынуліся пад вадой. Нас, даў Бог, бомбы абмінулі і мы паехалі далей. Калі даехалі да мора, гаспадары сталі грузіцца на судна, а мяне пакінулі на беразе.

Неўзабаве асвабадзілі нас рускія. Салдаты пачалі распытваць адкуль мы. Я сказаў, што з Беласточчыны, а адзін салдат абдымае мяне і пытаецца з якой я мясцовасці. „Ад Міхалова", — кажу. Салдат хвілінку падумаў і пытае: „З якой вёскі?" — „З Тайніцы-Гурнай, я — Аляксандр Бура". Салдат усміхнуўся, працягнуў руку і кажа: „А я з Юшкавага Груда, завуць мяне Валодзя Каліноўскі". Ён зараз прынёс мне некалькі бохнаў хдеба і на развітанне сказаў, што можа калі-небудзь па вайне сустрэнемся на радзіме. Так і сталася, што сустракаліся мы многа разоў.

Я падзяліўся хлебам з калегамі. Пасля сталі нас дэталёва рыспытваць, высвятляць хто паляк, а хто беларус. Палякаў адпраўлялі дадому. Я ў тым часе моцна захварэў на страўнік. Узялі мяне ў шпіталь, дзе я праляжаў некалькі месяцаў. Быў я вельмі аслаблены і думаў, што не выйду жывым. Аднак Бог даў, што рускія лекары мяне выратавалі. Выпісалі з бальніцы і сказалі: ідзі куды хочаш.

Дадому вяртаўся я праз Коўна, Гродна і Беласток. З Беластока памалу дабраўся ў Тайніцу-Гурную. Пасля вайны я 10 год правёў кавалерам. На танцы хадзіў я ў Луку, Рыбакі, Юшкаў Груд, Баршчэва. Аднойчы Ёзік Бірыцкі з Тарнопаля кажа мне, што ў іх вёсцы ёсць прыгожая дзяўчына, Насця Харкевіч. „Давай, завяду цябе ў сваты", — кажа. Ажаніўся я ў маі 1955 года, вянчаліся ў Нараўцы. І так жывём да сённяшняга дня.

Аляксандр Бура (ён мне не радня) — сціплы, сімпатычны чалавек, гатовы дапамагчы ў патрэбе кожнаму. Пасля вяртання з Нямеччыны гаспадарыў на 7 га слабой зямлі. Таму працаваў на розных пасадах, каб выгадаваць і вывучыць дзвюх дачок і сына.

Адгаданка

1. горад з беларускім музеем, 2. вялікі горад у Маньчжурыі на рацэ Сунгары, 3. сімвал хрысціянства, 4. мучны выраб з рэдкага цеста, спечаны на патэльні, 5. рэактыўны снарад, 6. невялікі звон, 7. касцявы ў роце, жалезны ў баране, 8. гарызонт, 9. наш надзённы прадукт харчавання.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — нідэрландская прыказка. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 50 нумара

Беседзь, воўк, вуха, дзея, дзядзіна, жыд, мыза, улоў, цяля, час, ява.

Рашэнне: **Дзяўчына выходзіць замуж дзеля сваякоў, удава дзеля сябе.**



Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 560 egz.

Перад намі чарговыя выклікі

Пра планы Аб'яднання „Музей малой айчыны" на 2009 год распавядае „Ніве" Дарафей Фіёнік.

Фота Ілоны КАРПЮК

Сям'я Фіёнікаў — бацькі Альжбета і Дарафей ды сыны Ілья і Максім

— ***З чым аб'яднанне ўвайшло ў новы год?***

— 2008 год быў для Аб'яднання „Музей малой айчыны" вельмі працавіты. Удаліся нам два фестывалі: веснавога фальклору „Там по маёвуй росі" і жніўны „Олень по бору ходіт", а гэта пры ўдзеле вялікай групы выканаўцаў аўтэнтычнага фальклору з беларускага Палесся. Гэты напрамак — беларускае Палессе і яго культура — будзем працягваць у будучым годзе. Напэўна наладзім ужо шосты выпуск фестывалю „Там по маёвуй росі", але таксама пройдзе шмат меншых мерапрыемстваў, якія назвалі мы адным галоўным лозунгам „Падляшска-палескі фестываль". Пад такой назвай выступім упершыню, хаця такія культурныя формы папулярызуем ужо пяць гадоў.

— ***Будуць таксама новыя кніжкі.***

— Так, з'явяцца тры новыя кніжкі, думаю, вельмі важныя. Фіналу дачакалася выданне „Слоўніка бельско-пудляскуй говоркі". Раней друкаваўся ён у частках у „Бельскім гасцінцы" як слоўнік мовы вёскі Храбалы Мікалая Врублеўскага. Зараз у супрацоўніцтве з аўтарам мы падрыхтавалі папраўлены і пашыраны варыянт слоўніка, на аснове мовы вёскі Храбалы і прадмесця Студзіводы. Слоўнік датычыць гаворкі з абшару між Бельскам, Гайнаўкай, Сямятычамі, гэтага цэлага моўнага арэалу, якім карыстаюцца падляшскія беларусы.

— ***Як гэты слоўнік адносіцца да працы над гаворкай Яна Максімюка?***

— Я вельмі добра ацэньваю працу Яна Максімюка, але напэўна з перспектывы Прагі справа маецца крыху інакш. Мы тут штодзень сустракаемся з моўнымі праблемамі, якія трэба вырашаць. У адрозненні ад Максімюка, мы ў нашай гаворцы аддаем перавагу кірыліцы, гэтай традыцыйнай сістэме запісу, якая прысутная ў нашай культуры ад тысячы гадоў і проста нам прыпісана. Аднак праца наша і Яна Максімюка знаходзяцца ў адной плыні — каб захаваць і ажывіць для чарговых пакаленняў мову падляшскіх беларусаў, бо я, так як і Ян Максімюк, лічу, што тут у нас, беларусаў Беласточчыны, існуюць дзве мовы: адна — гэта сучасная літаратурная мова і арэал гаворак, Сакольшчыны, Гарадоччыны, Беласточчыны, а другая — гэта мова, якую можна назваць падляшскай, людзі называюць яе руською, сваёю ці нашою. Гэта ўжо Гайнаўшчына, Бельшчына, Сямятычы. З гэтым звязаны факт, якога немагчыма аспрэчыць, менавіта што беларуская свядомасць носьбітаў гэтай мовы выкрышталізавана, намнога мацнейшая, чым у людзей, якіх мова бліжэйшая літаратурнай мове. Гэта гістарычны парадокс, але так яно ёсць. Мы выходзім насупраць патрабаванняў людзей, гэтаму служыць таксама „Бельскі гасцінец". Так склалася, што напрыканцы мінулага года выйшлі ажно тры нумары „Гасцінца". Дарэчы, у новым годзе хочам крыху памяняць яго форму. Магчыма паменшыцца колькасць нумароў у год, але гэта адбудзецца коштам змены афармлення, фармату і колькасці старонак.

— ***Другая кніжка накіраваная да іншага чытача.***

— Так, другая кніжка — гэта падборка тэкстаў для дзяцей з прыгожымі ілюстрацыямі Міраслава Здрайкоўскага. У дзіцячай кніжцы апынуліся вершы, калыханкі, лічылкі, дзіцячыя калядкі. А ўсё сабранае ў час запісаў на мясцовасці. Усё тым больш цікавае і важнае, што выдадзена ў атракцыйнай форме.

— ***Трэцяя кніжка гэта гістарычны ласунак.***

— Гэта кніжка Мікалая Давідзюка, напісаная на саліднай архіўнай аснове. На прыкладзе парафіі ў Курашаве паказвае механізмы ўводжвання неаўніі ў міжваенны перыяд. Кніжка можа здавацца сенсацыйнай, але гэта таму, што архіўная база паказвае якраз такія ўмовы.

— ***Дзейнасць аб'яднання гэта не толькі кніжкі. У Студзіводах неўзабаве адкрыецца чарговы будынак скансэна.***

— Гэта наш новы здабытак. Закончылі мы рэканструкцыю гарадской хаты з пачатку XIX стагоддзя, якую перанеслі з Бельска-Падляшскага. Гэта дом з вялікай гісторыяй. Зараз займаемся афармленнем інтэр'ераў. Будзе там экспазіцыйная зала, а таксама бібліятэка нашага аб'яднання. Называем яе Народнай бібліятэкай-чытальняй, звяртаючыся да старых чытальняў, якія існавалі на Бельшчыне сто гадоў таму. А ў экспазіцыйнай зале пакажам інтэр'ер гарадскога дома з канца XIX стагоддзя, разам з дакументамі і здымкамі людзей, звязаных з гэтым домам. Будзе там таксама археалагічная выстаўка таго, што знайшлі пад гэтым домам у час археалагічных даследаванняў. Аказалася, што культурны пласт пад гэтай хатай, а яна недалёка Замкавай гары, меў паўтара метра глыбіні ды 38 археалагічных пластоў, а там — помнікі бельскай культуры аж да пятнаццатага стагоддзя.

— ***Зямлю раскрылі пяць гадоў таму, чаму столькі часу прыйшлося нам чакаць гэтай экспазіцыі?***

— У час раскопак знайшлі мноства керамікі — 25 тысяч фрагментаў. Трэба было ўсё апрацаваць. Толькі некаторыя пасудзіны былі цэлымі. Археолаг, які вёў працы, Збігнеў Місюк, наколькі гэта было магчыма, паклеіў частку фрагментаў. Знайшлі і металёвыя элементы, сярпы, клямары, манеты. Усё трэба было закансерваваць. І зацягнулася сама пабудова дома: спачатку трэба было знайсці грошы, пасля фізічная праца, некаторых матэрыялаў вельмі доўга чакалі. Як аказваецца, гонта з'яўляецца таварам люкс, якога прыйшлося нам чакаць амаль год.

— ***Калі будзе можна наведаць ваш новы дом?***

— Думаю, што ўжо ў першай палове 2009 года.

— ***Ці прадбачваеце нейкія іншыя атракцыёны ці практыкаванні?***

— Напэўна будзе развівацца „Жэмэрва", наш фальклорны калектыў. У час зімовых канікул пройдуць музычныя майстар-класы. У нашым традыцыйным ужо месцы, у Крыўцы, будзем працаваць на аснове мясцовага фальклору. Нагадаю толькі, што ў мінулым годзе мы апрацавалі там цэлы спектакль вяселля, а гэта дзякуючы дапамозе мясцовага калектыву „Крыўчанкі". Хочам працягваць там мастацкую працу, будзем вучыцца іхняга спеву і танцаў. Але перад намі чарговы выклік. Паколькі „Жэмэрва" ўжо спявае і танцуе, хочам сарганізаваць і інструментальную групу. Аднак гэта не можа быць выпадковая група, у якой паявяцца традыцыйныя інструменты гэтага абшару, а гралі тут на скрыпках, бубнах, гармоніі, раней на цымбалах, а яшчэ раней на дудзе. На пераломе красавіка і траўня „Жэмэрва" запрошана ў Мінск на вялікі фестываль духоўнага спеву. Яшчэ працуем над рэпертуарам, але напэўна будуць гэта песні з нашых мясцовых, тыпова падляшскіх багагласнікаў, выкананыя ў тэхніцы адкрытага голасу. Перад намі шмат працы, а падляшска-палескі фестываль патрабуе асаблівай ангажаванасці, бо і ў яго рамках пройдуць зусім розныя мерапрыемствы, напрыклад, прэзентацыя прац мастакоў Берасцейшчыны ці прэзентацыя „Пінскай шляхты" ў выкананні пінскіх акцёраў на мове арыгінала. Адным словам, за гэты год хочам прыблізіць падляшукам творчасць палешукоў.

Гутарыла Ілона КАРПЮК

18.01 — 24.01

(22.03. — 20.04.) З 21.01. (да 25.01.) — стрэс, сваркі, правакацыі, непатрэбнае саперніцтва. На працы пазбягай спрэчак, старайся быць здалёк ад усіх непрыемных сітуацый. З 22.01. (да 26.01.) — ідэальны час на рандэву і любоўныя заваёвы. Выкарыстоўваючы сваю красу і прыемныя паводзіны, можаш шмат дасягнуць.

(21.04. — 21.05.) Спрэчнасць у напрамках. З 22.01. (да 26.01.) прадбачваюцца вялікія пертурбацыі. Можаш быць прыгнечаны, сумны, усё можа бачыцца ў цёмных колерах. Ды не страчвай ахвоты да жыцця, — не будзе так блага!

(22.05. — 22.06.) Трохі прытармазі, прадумай пару спраў, задумайся над далейшымі напрамкамі. Не давай партнёру дэкларацый, бо можа яшчэ адумаешся. На працы найлепш дагаворышся з жанчынамі.

(23.06. — 23.07.) Твой вораг — бяздзейнасць, дык старайся рабіць што-небудзь, абы толькі не сядзець склаўшы рукі, інакш час працячэ табе паміж пальцамі. Чакаюць цябе шматлікія выклікі, — калі за іх возьмешся — гарантаваны поспех! Калі нават прытрапяцца страты, не будуць яны цяжкія.

(24.07. — 23.08.) З 22.01. (да 26.01.) прадбачваецца многа шчасця, здзяйсненне мараў, пік у фінансах, дасканалы кантакт з людзьмі і добрае здароўе. Час любоўных заваёў, але пазбягай мімалётных фліртаў!

(24.08. — 23.09.) Да 20.01. добрая арыентацыя ў сітуацыі, добрыя нагоды паправіць свой рэйтынг. Меркурый, які ад 21.01. на зыходзе ў прыязным табе Казярогу прынясе спакой, добры настрой, творчыя думкі і новыя зацікаўленні. З 22.01. (да 26.01.) не слухай благіх дарадчыкаў. Ненайлепшы час заключаць дамовы, дамаўляцца ў важных для цябе справах.

(24.09. — 23.10.) З 22.01. (да 26.01.) знакаміты час на сустрэчы — і любоўныя, і ў інтарэсах; падпісвай дамовы, праводзь важныя размовы, доследы. Усё ж, з 21.01. (аж да 27.01.) можа табе папсавацца настрой, пагоршыцца ў фінансах; не рабі нічога забароненага законам!

(24.10. — 22.11.) Могуць дайсці да цябе прыкрыя інфармацыі, можаш падацца ў непрыемнае падарожжа. 19.01. — 23.01. — кантакты з неадпаведнымі людзьмі, кепскія дарадчыкі, фальшывыя сябры. Не падпісвай у гэты час ніякіх дамоў! З 24.01. пачнуцца клопаты ў пачуццёвым жыцці; каб пазбегнуць іх, мусіш моцна старацца!

(23.11. — 22.12.) Дасканалы настрой, аптымізм, які надзеліцца іншым, задавальненне самім сабой, моцная воля. Увесь тыдзень (і да 26.01.) — суцэльнае шчасце! Хоць 19.01. — 23.01. могуць трапіцца спрэчкі на працы (таксама і з-за тваёй запальчывасці) і клопаты са здароўем; не прымушай сябе да нічога.

(23.12. — 20.01.) З 22.01. (аж да 26.01.) будзеш жыццярадасны, жвавы, а твая нязломная воля давядзе да таго, што не будзе для цябе немагчымага. Выкарыстай энергію для спраў, патрабучых шмат высілку. З 21.01. — нялёгкі час для пачуццёвых сувязей.

(21.01. — 19.02.) 20-24.01. раптам паправіцца твая матэрыяльная сітуацыя. Выкарыстай момант і маланкава бярыся за выклікі, якія кідае табе лёс! 21.01. — выкажаш сур'ёзныя дэкларацыі. Аптымістычным падыходам з'яднаеш людзей.

(20.02. — 21.03.) 19-23.01. могуць прачнуцца ў табе лішне вялікія надзеі; не распавядай пра свае магчымасці і фантастычныя планы! На працы не задаволіць цябе малы поспех. Ды памятай — хітры траціць два разы!

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960